ДЗЕНЬ З ЭКСПЕРТАМ-КРЫМІНАЛІСТАМ
ЧЫРВОНКА





ЧАМУ ЗБЯДНЕЛІ ЖЫХАРЫ ЭСТОНІІ
13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
21 ЛІСТАПАДА 2024 г. ЧАЦВЕР № 227 (30361)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір НАВУМОВІЧ, намеснік міністра эканомікі:**

*«Прыняты закон аб прадпрымальніцкай дзейнасці, абноўлены закон па інвестыцыях. Дакументы ў прынцыпе перафарматавалі інвестыцыйнае і прадпрымальніцкае асяроддзе ў краіне. Новым механізмам у рамках закона па прадпрымальніцтве стала перарэгістрацыя індывідуальных прадпрымальнікаў дзень у дзень. Ім на сёння ўжо скарысталіся больш за 500 чалавек. Каб гэты «бясшвовы» механізм праходзіў у больш аптымальным фармаце для ІП, Мінэканомікі сістэмна працавала з калегамі, з органамі-рэгулятарамі, каб усе нормы, закладзеныя ў закон, у рамках «бясшвовага» пераходу выконваліся».*

# СПРАВА ЖЫЦЦЯ



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Гэтымі днямі ў Цэнтральным раёне сталіцы хуткімі тэмпамі ідзе рэканструкцыя з капітальным рамонтам кінатэатра «Масква». Работы вядуцца БУ-3 ААТ «Будтрэст № 1».

Для брыгадзіра тынкоўшчыкаў Кацярыны ДАРЫЙ гэты аб'ект далёка не першы. І не дзіўна, бо на працу ў будаўнічае ўпраўленне яна прыйшла аж но ў далёкім 1971 годзе, пасля заканчэння вучылішча. І вось ужо 53 гады шчыруе на прадпрыемстве, з іх каля 30 узначальвае брыгаду. Кацярына Якаўлеўна разам з калегамі-будаўнікамі ўдзельнічала ва ўзвядзенні такіх знакавых аб'ектаў, як Помнік воінам-інтэрнацыяналістам, Палац Рэспублікі, Храм-помнік усіх Святых, стадыён «Дынама»...

Працавітасць, адказнасць і прафесіяналізм Кацярыны Дарый былі адзначаны дзяржаўнай узнагародай — медалём «За працоўныя заслугі».

## КОРАТКА

- Аляксандр Лукашэнка памілаваў яшчэ 32 асуджаных за экстрэмісцкія злачынствы.
- 21—22 лістапада 2024 года адбудзецца візіт парламенцкай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь для ўдзелу ў чарговым пасяджэнні Савета і 57-м пленарным пасяджэнні Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў-удзельніц СНД у Санкт-Пецярбургу.
- **Навучыць дзяцей бяспечным паводзінам. У Гродне стартаваў фестываль МНС «Бяспечнае дзяцінства».**
- Больш за 500 індывідуальных прадпрымальнікаў перарэгістраваліся ў юрыдычныя асобы з 1 кастрычніка.

Соцыум

# ШЧАСЦЕ ТАМ, ДЗЕ СЯМ'Я

### Эксперты абмеркавалі меры дзяржаўнай падтрымкі і традыцыйныя для кожнага беларуса каштоўнасці

**У нашай краіне вялікая ўвага ўдзяляецца рэалізацыі праграм, накіраваных на падтрымку сям'і і дзяцей, а таксама ініцыятыў, якія садзейнічаюць гарманічнаму развіццю дзяцей. Як фінансавыя меры дзяржаўнай падтрымкі, ільготы і сацыяльныя выплаты дапамагаюць выхаванню дзяцей, а таксама пра ўзаемадзеянне грамадскіх арганізацый з дзяржаўнымі ўстановамі, расказалі спецыялісты.**

### ДАПАМОГІ, ІЛЬГОТЫ, САЦПАСЛУГІ

— Сістэма дзяржаўнай падтрымкі ў выглядзе дапамог істотная, дакладна выбудаваная. Сёння няма жанчыны, якая б не была ёй ахоплена. Памер дзяржаўнай дапамогі не залежыць ад статусу маці: працуе яна, з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, ці самазанятай, ці хатняй гаспадыняй. Дапамога па доглядзе дзіцяці не залежыць ад выплаты страхавых узносаў у ФСАН, — расказала **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарвыканкама Вольга ВАСІЛЕЎСКАЯ**.

СТАР. 5

Актуальна

# Узровень энергетычнай самастойнасці краіны істотна павысіўся




**Пра гэта расказаў намеснік старшыні Дзяржстандарту — дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Віталь КРЭЦКІ на практычнай канферэнцыі ў Мінску па тэме павышэння энергаэфектыўнасці эканомікі.**

Ён адзначыў, што з моманту атрымання незалежнасці ў краіне востра паўстала пытанне, дзе ўзяць энергарэсурсы, каб задаволіць патрэбнасць у іх эканомікі. Былі знойдзеныя рэзервы зніжэння энергаёмістасці ўнутранага валавога прадукту. Дзякуючы прынятым мерам удалося знізіць энергаёмістасць ВУП краіны ў параўнанні з 1993 годам — у 4,7 раза.

### Па розных кірунках

Задача па выніках цяперашняй пяцігодкі — мінус 7 % да ўзроўню 2021 года. Дырэктар дэпартамента заўважыў, што рэалізаваныя мерапрыемствы даюць эканамічны эфект: толькі за восем месяцаў бягучага года энергаёмістасць зніжана на 1,6 % да ўзроўню адпаведнага перыяду мінулага года пры гадавым заданні 1,5 %.

СТАР. 12

ISSN 1990 — 763X
24227

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Ідзе падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2025 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2025 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



Ва ўрадзе

# Драйверы росту — прамысловасць, будаўніцтва і гандаль

## Сітуацыя ў эканоміцы стабільная, павышаецца ўзровень жыцця насельніцтва

**Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА падчас пасяджэння Савета Міністраў, перадае БелТА.**

«У студзені — верасні з пяці найважнейшых паказчыкаў эфектыўнасці работы ўрада і Нацыянальнага банка выканана чатыры. Забяспечана выкананне паказчыка па росце валавога ўнутранага прадукту (тэмп росту 104,5 працэнта пры прагнозе 103,4 працэнта), інвестыцый (107,6 працэнта пры плане 102,7 працэнта), рэальных даходаў насельніцтва (109,4 працэнта пры плане 103,1 працэнта). Інфляцыя — 3,8 працэнта да снежня 2023 года пры прагнозе не больш за 4,6 працэнта. Недавыкананы паказчык па экспарце тавараў і паслуг — тэмп росту 104,4 працэнта пры заданні 105,3 працэнта», — адзначыў Раман Галоўчанка.

Паводле яго слоў, асноўныя драйверы росту — прамысловасць, будаўніцтва і гандаль. «Усе рэгіёны ўнеслі станоўчы ўклад у фарміраванне ВУП. Лідарам застаецца Мінская вобласць. Адстае ад калег Гомельская. Гэта адзіны рэгіён, які не выканаў заданне па ВУП. Рост ёсць да мінулага года, але не той, на які мы разлічвалі», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Усе абавязацельствы сацыяльнага характару выконваюцца своечасова і ў поўным аб'ёме, падкрэсліў кіраўнік беларускага ўрада. «У запланаваных параметрах вытрымліваецца ўзровень інфляцыі. Забяспечваецца макраэканамічная стабільнасць. За мінулы перыяд золатавалютныя рэзервы краіны павялічыліся на $800 млн і на 1 лістапада склалі $8,9 млрд. Расце давер насельніцтва да нацыянальнай валюты: з пачатку года выраслі тэрміновыя банкаўскія ўклады грамадзян у беларускіх рублях», — звярнуў ён увагу.

Планамерна забяспечваецца найважнейшая мэтавая задача павышэння ўзроўню жыцця насельніцтва. «У студзені — верасні рэальныя наяўныя даходы растуць хутчэй, чым планавалі. Сярэдняя зарплата па краіне дасягала Br2,2 тыс., у рэальным выражэнні гэта рост на 13 працэнтаў. Пенсіі павялічыліся на 9,7 працэнта, сярэдні памер пенсіі склаў у верасні Br803. У бюджэтнай сферы рэальная заработная плата вырасла на 11,7 працэнта», — адзначыў Раман Галоўчанка.

За дзевяць месяцаў краіна экспартавала тавараў і паслуг на $36,7 млрд з прыростам да мінулага года на $1,5 млрд. Тэмп росту 104,4 працэнта пры заданні 105,3 працэнта. Паводле слоў прэм'ер-міністра, паказчык недавыкананы ў сувязі з многімі фактарамі, уплываў кан'юнктурных змяненняў. Разам з тым актыўна ідзе дыверсіфікацыя экспартных патокаў. За дзевяць месяцаў экспарт у краіны Афрыкі вырас у 3,7 раза, а колькасць афрыканскіх краін — пакупнікоў беларускай прадукцыі ўзрасла да 45.

Тэмп росту інвестыцый — 107,6 працэнта, гэта значна вышэй за прагнозны параметр. «Разам з тым застаюцца нявырашаныя пытанні. Галоўным з іх бачу я своечасовае асваенне па інфраструктурных праектах у рэгіёнах, што рэалізоўваюцца ў рамках асобных рашэнняў кіраўніка дзяржавы», — заўважыў Раман Галоўчанка.

«Калі гаварыць увогуле, то сітуацыя ў эканоміцы стабільная, кіравальная і ёсць усе шанцы закончыць год у планавых параметрах, каб перайсці да завяршальнага года пяцігодкі з добрай пазіцыяй», — рэзюмаваў кіраўнік беларускага ўрада.

Задача эканомікі Беларусі на 2025 год — расці вышэй за сусветныя тэмпы. Аб гэтым заявіў **міністр эканомікі Юрый ЧАБАТАР.** «Трэба апераджальнымі тэмпамі аднаўляць свой патэнцыял. Рынкі для гэтага ёсць, у тым ліку азіяцкія. Экспартныя магчымасці для нашых прадпрыемстваў у многім адкрыты. У экспарце дынаміка ў нас дадатная, асабліва, што радуе, у экспарце паслуг. Аднаўляюцца асноўныя нашы галіны. Гэта сфера транспарту, будаўнічых паслуг, адукацыі і гэтак далей. Дадатная дынаміка ў IT-галіне», — адзначыў Юрый Чабатар. Што датычыцца паставак тавараў за мяжу, міністр адзначыў, што ўдалося пераарыентаваць асноўныя экспартныя патокі. Больш высокімі тэмпамі растуць продажы ў краіны далёкай дугі.

Пералік рэгіянальных праектаў у рамках ініцыятывы «Адзін раён — адзін праект» плануецца пашырыць, падкрэсліў Юрый Чабатар. «Амаль 50 праектаў ужо рэалізавана ў рамках ініцыятывы «Адзін раён — адзін праект». Да канца года мы бачым дадатную дынаміку. І, што самае галоўнае, гэта ініцыятыва не будзе спынена. Мы разглядаем ва ўрадзе ўдакладненне пераліку, ён будзе дапоўнены больш як 40 праектамі. Колькасць новых рабочых месцаў у рамках гэтых праектаў складзе амаль 11 тысяч», — адзначыў Юрый Чабатар.

Ён заўважыў, што інвестыцыі з'яўляюцца ключавым напрамкам. «Мы бачым паскарэнне росту гэтага паказчыка. Літаральна месяц таму быў тэмп 107,6 працэнта, сёння ўжо больш як 108 працэнтаў. Для нас галоўнае — якасць гэтых інвестыцый. Адзначаем павелічэнне ўкладанняў нашых прадпрыемстваў у актыўную частку. Размова ідзе аб машынах, абсталяванні. Хуткае абнаўленне садзейнічае вытворчасці канкурэнтаздольнай прадукцыі і яе пастаўцы на экспарт», — падкрэсліў міністр.

26 студзеня 2025
ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# Электаральная кампанія праходзіць актыўна

**На чарговым пасяджэнні Цэнтральнай выбарчай камісіі разгледжаны і зацверджаны шэраг дакументаў, якія рэгламентуюць выбарчы працэс.**

Як паведаміў на пасяджэнні ЦВК старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар Карпенка, сёння працягваецца працэс збору подпісаў грамадзян у падтрымку вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. І гэты працэс ідзе даволі актыўна. На дадзены момант па зборы подпісаў працуе пяць ініцыятыўных груп. Гэтая работа працягнецца да 6 снежня ўключна. Затым тэрытарыяльныя камісіі пачнуць праверку дакладнасці сабраных подпісаў грамадзян.

Кіраўнік Цэнтрвыбаркама адзначыў, што тэрытарыяльнымі камісіямі па выбарах Прэзідэнта (іх сфарміравана 153) па стане на 18 лістапада акрэдытаваны 800 нацыянальных назіральнікаў. З іх 102 — моладзь ва ўзросце да 31 года, 590 жанчын, палітычныя партыі вылучылі 144 назіральнікі, грамадскія аб'яднанні — 579. Пры ЦВК Беларусі акрэдытаваны шэсць нацыянальных назіральнікаў. Акрэдытацыя нацыянальных назіральнікаў завершыцца камісіямі 20 студзеня 2025 года.

На пасяджэнні ЦВК зацверджаны парадак работы інфармацыйнага цэнтра ЦВК Беларусі, які будзе працаваць на базе Палаца Рэспублікі з 24 да 27 студзеня. Таксама разгледжана палажэнне аб парадку выкарыстання сродкаў масавай інфармацыі пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Так, згодна з дакументам, кожнаму кандыдату будзе дадзена магчымасць два разы ў прамым эфіры выступіць на тэлеканале «Беларусь 1» і Першым нацыянальным канале Беларускага Радыё. На кожнае выступленне зарэзервавана не больш як 30 хвілін, эфірны час у радыё- і тэлеэфіры будзе выдзелены ў перыяд з 8 да 17 студзеня 2025 года па працоўных днях. Выступленні будуць выходзіць у эфір у прайм-тайм: па тэлебачанні з 19.00 да 20.00 гадзін, на радыё — з 8.00 да 9.00. Для кандыдатаў прадугледжана магчымасць запісаць выступленне, каб яно транслявалася ў запісе. Канкрэтныя даты і час выступленняў будуць вызначацца жараб'ёўкай пасля рэгістрацыі кандыдатаў у Прэзідэнты.

Як падкрэсліў ў ЦВК, з перадвыбарным выступленнем кандыдат у Прэзідэнты выступае асабіста, а для ўдзелу ў тэледэбатах мае права накіраваць сваю даверaную асобу. Што датычыцца апублікавання перадвыбарных праграм кандыдатаў, то для гэтых мэт вызначаны дзве рэспубліканскія газеты — «Рэспубліка» і «Звязда». Прычым у газеце «Звязда» перадвыбарныя праграмы будуць публікавацца выключна на беларускай мове.

Таксама падчас пасяджэння ЦВК зацвердзіў склад Назіральнага савета па кантролі за перадвыбарнай агітацыяй у СМІ. Вызначаны і парадак дзейнасці Цэнтра грамадскага назірання на выбарах Прэзідэнта — плануецца яго стварэнне грамадскімі аб'яднаннямі на базе Палаца прафсаюзаў.

Акрамя таго, Цэнтрвыбаркамам зацверджаны парадак дэкларавання даходаў і маёмасці прэтэндэнтаў на вылучэнне кандыдатамі ў прэзідэнты. Як адзначыла сакратар ЦВК Алена Балдоўская, асобы, якія вылучаюцца ў кандыдаты, могуць знайсці форму для запаўнення звестак аб даходах на сайце Цэнтральнай выбарчай камісіі або звярнуцца па бланк непасрэдна ў ЦВК. Пры гэтым у зацверджанай на пасяджэнні пастанове падрабязна прапісаны ўсе патрабаванні да запаўнення гэтай дэкларацыі. Яны датычацца дакладных фармулёвак, указання поўных звестак і запаўнення ўсіх граф. Сама дэкларацыя прадугледжвае запаўненне трох раздзелаў. У першым запаўняюцца звесткі аб даходах, атрыманых за адпаведны перыяд. Пры гэтым паказваюцца даходы, атрыманыя з 1 студзеня да 31 снежня 2023 года. Другі раздзел — аб рухомай і нерухомай маёмасці. Трэці раздзел прадугледжвае ўказанне іншых звестак аб даходах, якія не ўвайшлі ў пералік у двух папярэдніх раздзелах. У дачыненні да маёмасці, якая належыць на правах агульнай сумеснай уласнасці мужа і жонкі, яе неабходна паказваць у поўным аб'ёме з указаннем так званага тытульнага ўладальніка. У ЦВК звярнулі ўвагу, што кандыдаты ў прэзідэнты павінны будуць падаць дэкларацыі не толькі аб сваіх даходах, але і аб даходах мужа і жонкі і блізкіх сваякоў, якія сумесна пражываюць і вядуць агульную гаспадарку.

Таксама на пасяджэнні разгледжаны парадак галасавання ў месцах часовага знаходжання выбаршчыкаў.

**Паводле БелТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ЗША працягваюць спробы разгойдвання абстаноўкі ў Грузіі



У краіне падрыхтаваны групы тых, хто пратэстуе, для вырашэння «сілавых задач», уключаючы ўзброенае супрацьстаянне з органамі правапарадку. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на крыніцу ў рэгіёне. Па інфармацыі суразмоўцы агенцтва, ЗША рэкамендуюць лідарам грузінскай апазіцыі настойваць на тым, што вынікі парламенцкіх выбараў 26 кастрычніка нібыта сфальсіфікаваны. «Паралельна апазіцыі прадпісваецца мабілізаваць прыхільнікаў для арганізацыі пратэстаў і блакіравання пачатку работы «нелегітымнага парламента» (першае пасяджэнне запланавана на 25 лістапада). Ставіцца задача дабівацца фарміравання «пераходнага ўрада» на чале з прэзідэнтам Саламэ Зурабішвілі з прыцэлам на правядзенне новых выбараў», — дадаў ён. Суразмоўца агенцтва адзначыў, што для матэрыяльнага стымулявання пратэснай актыўнасці прадугледжана штодзённая выплата ўзнагароджання ўдзельнікам: «Наяўная валюта ў разліку на 20 дзён знаходзіцца ў Пасольстве ЗША ў Тбілісі».

## У Варшаве больш за дзве тысячы медсясцёр і акушэрак выйшлі на пратэст з-за дзеянняў урада




Яны пратэставалі перад офісам прэм'ер-міністра Дональда Туска, патрабуючы павышэння заработнай платы і вырашэння пытання сур'ёзнага недахопу кадраў у сістэме грамадскай аховы здароўя. Аб гэтым паведаміла радыё RMF24. «Нас занадта мала, і нічога не робіцца для таго, каб заахвоціць маладых людзей ісці ў прафесію. Па-ранейшаму нашы інтарэсы становяцца прадметам непрыемнай палітычнай гульні», — сказала адна з пратэстоўцаў. Адзначаецца, што да 2030 года большасць медсясцёр могуць пакінуць сістэму, паколькі дасягнуць пенсіённага ўзросту. «Сярэдні ўзрост у бальніцы, у якой я працую, складае 50 гадоў. Акушэркі і медсёстры хочуць, сярод іншага, каб кіраўнік урада разабраўся з законапраектам аб самай нізкай заработнай плаце ў ахове здароўя. «Аддайце грошы з бюджэту ў Нацыянальны фонд аховы здароўя», — скандзіравалі пратэстоўцы.

## Сусветны экспарт кавы вырас да больш чым 137 мільёнаў мяшкоў



Сусветны экспарт кавы ў 2023/2024 маркетынгавым сезоне (кастрычнік — верасень) павялічыўся на 11,7 працэнта — да 137,2 мільёна мяшкоў (па 60 кілаграмаў). Пра гэта паведамляецца ў справаздачы Міжнароднай арганізацыі па каве (ICO). У тым ліку адгрузкі зялёнай (неабсмажанай) кавы выраслі на 11,8 працэнта — да 123,7 мільёна мяшкоў. Сярод макрарэгіёнаў пазіцыю найбуйнейшага экспарцёра кавы захоўвае Паўднёвая Амерыка, якая нарасціла пастаўкі на 30,7 працэнта — да 66,1 мільёна мяшкоў. У тым ліку ў Бразіліі зафіксаваны рэкордны паказчык адгрузак кавы ў больш за 49 мільёнаў мяшкоў. Продажы з дзяржаў Азіі і Акіяніі ў сезоне, які завяршыўся, знізіліся на 6,7 працэнта (да 40,6 мільёна мяшкоў), тады як Афрыка павялічыла пастаўкі на 17,3 працэнта (да 16 мільёнаў мяшкоў).

Парламенцкі дзённік

# «Вельмі шмат залежыць ад маладых спецыялістаў, якія павінны падставіць плячо дзяржаве»



Фота БелТА.

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА сустрэўся са студэнтамі Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта. Мерапрыемства не толькі знакавае, але і сімвалічнае. Гэтай сустрэчай дадзены старт інфармацыйна-асветніцкага праекта «Моладзь для Беларусі!».**

Ігар Сергяенка таксама павіншаваў БДАТУ з 70-годдзем стварэння. Ён адзначыў, што гэтая ВНУ з'яўляецца флагманам падрыхтоўкі кадраў для стратэгічна важнай сферы эканомікі, дзейнасць выпускнікоў БДАТУ непасрэдна звязана з забеспячэннем нацыянальнай бяспекі.

«Вельмі шмат сёння залежыць ад маладых спецыялістаў, якія сваімі ініцыятывамі, крэатыўнымі ідэямі і прапановамі, актыўнай добрасумленнай працай павінны падставіць плячо дзяржаве, годна прадоўжыць дзяржаўны курс на будаўніцтва моцнай і незалежнай Беларусі», — падкрэсліў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. У сваім выступленні ён таксама закрануў тэму прэзідэнцкай выбарчай кампаніі, якая стартавала ў краіне, і адзначыў ролю дзеючага кіраўніка дзяржавы як нацыянальнага лідара ў стварэнні мадэлі беларускай дзяржаўнасці, арыентаванай на чалавека.

Праект «Моладзь для Беларусі» накіраваны на студэнтаў, лідараў маладзёжных грамадскіх арганізацый і першакурснікаў. У рамках праекта запланаваны сустрэчы дэпутатаў і членаў Маладзёжнага парламента са студэнтамі ўсіх факультэтаў ВНУ краіны. Агульная тэма для абмеркавання — дасягненні Беларусі за апошнія 30 гадоў і перспектывы далейшага развіцця краіны з улікам палажэнняў перадвыбарнай праграмы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Ігар Сергяенка ў рамках праекта прапанаваў абмеркаваць умовы, створаныя ў Беларусі для самарэалізацыі маладога пакалення, і таксама перспектывы стварэння дадатковых сацыяльных ліфтаў і новых форм дыялогу ўлады і моладзі. Як адзначыў Ігар Сергяенка, меркаванне студэнтаў важнае і пры абмеркаванні пытання аб пашырэнні форм падтрымкі сацыяльна значных маладзёжных ініцыятыў.

Сёння гэтыя ідэі рэалізоўваюцца ў рамках дзейнасці Савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, дзейнасці БРСМ, Савета маладых вучоных пры Міністэрстве адукацыі, універсітэцкіх і Нацыянальнага дзіцячага тэхнапаркаў, сістэмы адкрытых конкурсаў і выдзялення грантаў на рэалізацыю маладзёжных праектаў і інш.

У дыялогавых пляцоўках праекта «Моладзь для Беларусі» будуць удзельнічаць вядомыя беларусы, якія дасягнулі выдатных поспехаў у розных прафесійных сферах, маюць багаты кіраўніцкі, дзяржаўны, навуковы, вытворчы вопыт. Прамежкавае падвядзенне вынікаў праекта намечана на 20 студзеня 2025 года ў Авальнай зале.

**Паводле прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.**

Супрацоўніцтва

# Медыякампанія Саюзнай дзяржавы, адмена роўмінгу і дакументальны фільм

### Якія задачы стаяць перад саюзнай інфармацыйнай прасторай

**Актуальныя пытанні Саюзнай інтэграцыі абмеркавалі ўдзельнікі пасяджэння Камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па інфармацыйнай палітыцы, інфармацыйных тэхналогіях і сувязі. У мерапрыемстве прынялі ўдзел старшыня камісіі Ігар Луцкі, намеснік старшыні Сяргей Пахомаў, члены камісіі Мікалай Бузін і Наталля Ніканорава. Акрамя таго, у пасяджэнні ўдзельнічалі прадстаўнікі Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы, Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Беларусі, Міністэрства лічбавага развіцця, сувязі і масавых камунікацый Расіі, Міністэрства інфармацыі Беларусі, кіраўнікі СМІ саюзнай дзяржавы.**

У парадак дня пасяджэння было ўключана пытанне аб стварэнні медыякампаніі Саюзнай дзяржавы. Дэпутатам была прадстаўлена інфармацыя аб рабоце па стварэнні медыякампаніі Саюзнай дзяржавы. Дэпутаты — члены Камісіі Парламенцкага сходу па інфармацыйнай палітыцы, інфармацыйных тэхналогіях і сувязі рэкамендавалі Пастаяннаму камітэту Саюзнай дзяржавы своечасова інфармаваць камісію аб стратэгіі развіцця АНА «Медыякампанія Саюзнай дзяржавы» з улікам інтэграцыі дзеючых сродкаў масавай інфармацыі Саюзнай дзяржавы ў структуру медыякампаніі.

Парламентарыі разгледзелі і пытанне аб устанаўленні камфортных тарыфаў для карыстання паслугамі сувязі і перадачы даных на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы. «Паводле прадстаўленай інфармацыі, з 1 сакавіка 2025 года для беларускіх і расійскіх абанентаў на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы будуць даступны паслугі па тарыфах, супастаўных з коштам паслуг у дамашняй сетцы. На працягу каляндарнага месяца абаненты змогуць скарыстацца не менш чым 300 хвілінамі», — паведамілі ў прэс-службе Парламенцкага сходу. Саюзныя парламентарыі зазначылі, што ўжо дасягнутыя вынікі праведзенай работы па адмене роўмінгу прывялі да росту спажывання паслуг галасавой сувязі на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы. Адмена роўмінгу на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы стане рэальнай прыладай паглыблення інтэграцыйных працэсаў.

У парадак дня пасяджэння таксама было ўключана пытанне аб інфармацыйным забеспячэнні мерапрыемстваў Парламенцкага сходу па святкаванні 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў. Пералік мерапрыемстваў быў ухвалены Саветам Парламенцкага сходу 23 верасня 2024 года на пасяджэнні камісіі ў Магілёве. Парламентарыі даручылі кіраўнікам сродкаў масавай інфармацыі Саюзнай дзяржавы падрыхтаваць планы па інфармацыйным забеспячэнні мерапрыемстваў Парламенцкага сходу, прысвечаных 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. «Тэлерадыёвяшчальнай арганізацыі Саюзнай дзяржавы і Сакратарыяту Парламенцкага сходу даручана прапрацаваць пытанне стварэння дакументальнага фільма, прысвечанага юбілею Перамогі», — адзначылі ў прэс-службе.

З нагоды

# ЦАНІЦЬ І ПРАДАЎЖАЦЬ

### На сустрэчы Пятра ПАРХОМЧЫКА з моладдзю гаварылі пра гісторыю, дасягненні і планы

**У Івацэвічах адбылася сустрэча моладзі першага рэгіёна са старшынёй Брэсцкага аблвыканкама Пятром Пархомчыкам. Сустрэча прысвячалася 85-годдзю Брэсцкай вобласці. У адкрытым дыялогу ўзялі ўдзел каля 130 студэнтаў і маладых працаўнікоў. Кіраўнік рэгіёна напомніў аб гістарычных вехах станаўлення краіны і вобласці, спыніўся на дасягненнях апошніх 30 гадоў, расказаў пра эканамічныя і сацыяльныя паказчыкі дня сённяшняга.**



Губернатар таксама нагадаў суразмоўцам, што яны жывуць у рэгіёне, які дынамічна развіваецца, рэгіёне з устойлівай эканомікай і сучаснай сацыяльнай сферай, дзе усе намаганні накіраваны на забеспячэнне дастойнага ўзроўню жыцця людзей. І падкрэсліў, што за 30 гадоў суверэннага развіцця Брэсцкая вобласць значна прымножыла свой эканамічны патэнцыял, выйшла на тэрыторыю ўстойлівага росту, а па многіх кірунках — на лідарскія пазіцыі ў краіне. Напрыклад, па тэмпах прыросту эканомікі вобласць — у тройцы лідараў сярод рэгіёнаў Беларусі. Толькі за апошнія паўтара дзесяцігоддзя прадукцыйнасць працы павялічылася амаль у 1,5 раза. Аб'ём прамысловай вытворчасці вырас у чатыры разы. Створаны новыя вытворчасці, прадпрыемствы, цэлыя галіны. Паколькі сустрэча праходзіла на тэрыторыі ААТ «Івацэвічдрэў», гаварылі таксама пра імпульс, які атрымала мэблевая галіна. Магчыма, не ўсе ведалі, што амаль палова мэблевай вытворчасці краіны знаходзіцца ў Брэсцкай вобласці.

Паводле слоў Пятра Пархомчыка, аграпрамысловы комплекс рэгіёна — асаблівы прадмет гонару. Напрыклад, па ўдоі малака на карову (7268 кг) вобласць займае першае месца ў Беларусі, па іншых асноўных паказчыках таксама на першых прыступках, у тым ліку па аб'ёмах экспарту сельскагаспадарчай прадукцыі і харчовых тавараў.

Кіраўнік вобласці таксама спыніўся на дасягненнях сацыяльнай сферы, сказаў аб дзяржаўнай падтрымцы сем'яў і выказаў упэўненасць, што маладое пакаленне будзе цаніць сваю малую радзіму, той грунтоўны падмурак, які стварылі папярэднікі, і памнажаць яго самаадданай працай.

Асноўная ж частка сустрэчы прайшла ў форме дыялогу, калі маладыя людзі маглі задаваць пытанні і атрымліваць вычарпальныя адказы. З аўдыторыі цікавіліся, якія любімыя месцы ўжо ёсць у кіраўніка вобласці, што асабліва прыцягвае яго ўвагу. У адказ ён адзначыў, што цяпер ажыццяўляе даволі многа рабочых паездак, асаблівую ўвагу ўдзяляе знаёмству з прамысловымі прадпрыемствамі: «Для мяне няма розніцы, дзяржаўнае гэта прадпрыемства ці прыватнае. Мы будзем падтрымліваць усіх, хто мае слушную ідэю, бачыць шляхі для яе рэалізацыі».




Ну і асаблівым месцам кіраўнік вобласці назваў Брэсцкую крэпасць: «Гэта сапраўды святое, у пэўным сэнсе намоленае месца, якое кожны чалавек павінен наведваць як мінімум раз на год. Там вядзецца вялікая рэканструкцыя. Укладваюцца сродкі саюзнага бюджэту. Ёсць вялікае поле для ўдзелу і нашай моладзі,» — падкрэсліў губернатар і ўдакладніў, што мае на ўвазе Рэспубліканскі цэнтр патрыятычнага выхавання моладзі.

Гаварылі аб тым, якія спецыяльнасці будуць запатрабаваныя ў будучым, як спецыялісту стаць прафесіяналам, як выхаваць у сабе лідарскія якасці, пра многае іншае. Пётр Пархомчык згадаў пра нядаўні ўчынак вайскоўца 111-й гвардзейскай артылерыйскай брыгады Ільі Касюка. Яфрэйтар выратаваў чатырохгадовага хлопчыка, які вісеў на ўзроўні трэцяга паверха, трымаючыся за бялізнавую вяроўку. Ілья не разгубіўся, правільнае рашэнне прыняў за долі секунды, распасцёр сваю куртку і злавіў малога літаральна ў рукі. «Я падрыхтаваў для Ільі запрашэнне на ўрачысты вечар 4 снежня, калі будзем адзначаць 85-годдзе Брэсцкай вобласці,» — сказаў старшыня аблвыканкама, і маладыя людзі адказалі дружнымі апладысментамі.

Удзельнікі сустрэчы з губернатарам таксама атрымалі магчымасць пабываць на экскурсіі ў цэхах прадпрыемства «Івацэвічдрэў» і нават паўдзельнічаць у цырымоніі пуску новай лініі.

Варта сказаць, што адкрытае акцыянернае таварыства «Івацэвічдрэў» з'яўляецца адным з найлепшых прадпрыемстваў у краіне ў сферы дрэваапрацоўкі. Запуск новай лініі ламініравання драўляна-стружачных пліт уласнай вытворчасці стаў магчымым у рамках рэалізацыі інвестыцыйнага праекта. Лінія дазволіць павялічыць аб'ёмы выпуску, пашырыць асартымент прадукцыі, скараціць тэрміны выканання заказаў, а таксама зробіць магчымым выпускаць зусім новы прадукт — пліты з глыбокімі структурамі паверхні, а яшчэ ламініраваныя пліты, дзе цісненне паверхні максімальна імітуе натуральную драўніну. Названая прадукцыя ўпершыню будзе рэалізаваная на рынку ламініраванай ДСП у нашай краіне.

Агульны бюджэт праекта склаў 37,9 мільёна рублёў. Прадпрыемства выкарыстала як уласныя сродкі, так і сродкі абласнога і рэспубліканскага інавацыйных фондаў, а таксама крэдыты.

— Праект па ламініраванні выглядае надзвычай важным сёння, — сказаў старшыня аблвыканкама Пётр Пархомчык. — Новае абсталяванне, якое ўстаноўлена, дапаможа павялічыць рэалізацыю нашай прадукцыі ў першую чаргу на экспарт.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Брэсцкага аблвыканкама.**

# Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў працуюць у рэгіёнах

## Дапамагаць па месцах і ўлічваць інтарэсы людзей у заканатворчасці

### Дэпутат Наталля АЎСЯННІКАВА пра работу ў Слуцкім раёне

**Слухаць людзей і супрацоўнічаць з уладай на месцах — важныя задачы для дэпутацкага корпуса ўсіх узроўняў. Народныя выбраннікі на пастаяннай аснове праводзяць дыялогавыя пляцоўкі, круглыя сталы, асабістыя сустрэчы з грамадзянамі, удзельнічаюць у розных мерапрыемствах. Больш падрабязна аб рабоце ў Слуцкай 67-й акрузе карэспандэнту «Звязды» расказала член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Наталля Аўсяннікава.**




***— Наталля Аляксандраўна, з чаго пачалося ваша знаёмства з акругай і выбаршчыкамі?***

— З 1 красавіка 2024 года я прыступіла да работы парламентарыя. Мы, дэпутаты, праводзім пэўную работу, у якой можна вылучыць тры асноўныя складальнікі: заканатворчая і міжнародная дзейнасць, а таксама работа з выбаршчыкамі ў акрузе. Удасканаленне заканадаўства ў інтарэсах грамадзян, дапамога ў вырашэнні вострых пытанняў — тыя задачы, над якімі працуюць усе нашы народныя выбраннікі.

У рамках работы ў сваёй акрузе рэгулярна праводжу сустрэчы з многімі калектывамі прадпрыемстваў і арганізацый, прадстаўнікамі раённых арганізацый грамадскіх аб'яднанняў. Акрамя гэтага, сустрэчы з выбаршчыкамі праводзяцца ў рамках адзінага дня інфармавання.

Адно з ключавых месцаў у дзейнасці дэпутатаў займае работа з моладдзю. Так, напрыклад, падчас дыялогавай пляцоўкі з членамі Маладзёжнага парламента пры Слуцкім райсавеце навучэнцамі Слуцкага дзяржаўнага медыцынскага каледжа імя С. І. Шклярэўскага і Мінскага абласнога кадэцкага вучылішча былі абмеркаваны важныя і актуальныя пытанні. Не так даўно правяла інфармацыйную сустрэчу з педагогамі (маладымі спецыялістамі) Случчыны ў Доме ўрада.

Прадстаўляць інтарэсы народа ў парламенце — адказная місія для дэпутата, які, працуючы ў акрузе, лепш ведае, чым жывуць людзі, якія праблемы іх хвалююць. Зыходзячы з гэтага і прымаюцца пэўныя рашэнні, а ў далейшым законы, накіраваныя на развіццё нашай краіны і ўмацаванне дабрабыту людзей.

***— Неад'емнай часткай работы дэпутатаў усіх узроўняў з'яўляецца правядзенне прамых тэлефонных ліній і асабістых прыёмаў грамадзян. Якія праблемы хвалююць жыхароў вашай акругі?***

Парламентарыі заўсёды знаходзяцца на сувязі са сваімі выбаршчыкамі. Традыцыйна падчас работы ў акрузе дэпутаты праводзяць работу са зваротамі грамадзян. Жыхары Случчыны звяртаюцца з самымі рознымі пытаннямі, большасць якіх растлумачана, некаторыя ўзяты на кантроль. За час работы ў парламенце ў ходзе прамой тэлефоннай лініі паступіла 25 зваротаў, у ходзе асабістага прыёму грамадзян — больш за 70. Вось некаторыя прыклады.

У вёсцы Селішча звярнуўся грамадзянін з пытаннем аб выдаленні аб'ектаў раслліннага свету. Сумесна са старшынёй Слуцкага раённага Савета дэпутатаў Аляксандрам Кураком пасля агляду дрэў патлумачылі заяўніку немэтазгоднасць іх выдалення. Падчас прыёму грамадзян у Казловіцкім сельвыканкаме жанчына агучыла пытанне аб рамонце дарогі ў вёсцы Блізкія Бондары. Пытанне было разгледжана з выездам на месца, узята на кантроль старшынёй сельвыканкама. Пасля звароту грамадзянкі аб затапленні кватэры суседзямі таксама пытанне было разгледжана камісійна, з выездам да заяўніка. Высветлілася, што праблема ў сістэме ацяплення. У наступным быў праведзены рамонт.

***— Раскажыце пра мерапрыемствы, у якіх вы бралі ўдзел.***

— Мы ўдзельнічаем ва ўрачыстых мерапрыемствах, прысвечаных знамянальным датам, дзяржаўным святам, у тым ліку 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Таксама наведала фестываль «Беларусь — мая песня», удзельнічала ў акцыі «Марафон адзінства» і ў абласным фестывалі працаўнікоў вёскі «Дажынкі», а яшчэ ў рэспубліканскай добраахвотнай акцыі «Дай лесу новае жыццё!».

Напярэдадні Дня Перамогі сустрэлася з тымі, хто прайшоў страшны ваенны час, — Гаўрыілам Іванавічам Шахновічам, Сцяпанам Іванавічам Макарэвічам і іншымі. Напярэдадні Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў уручыла падзячныя пісьмы Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігара Сергеенкі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны.

На мінулым тыдні разам са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў здзейсніла рабочую паездку ў маю акругу. Тут мы наведалі перапрацоўчыя прадпрыемствы аграпрамысловага комплексу, сустрэліся з кіраўніцтвам Мінскай вобласці, абмеркавалі асноўныя кірункі сумеснай работы і ролю дэпутатаў у вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва цэнтральнага рэгіёна. Рабочая паездка пачалася са знаёмства з найстаражэйшай Слуцкай гімназіяй № 1 і ўскладання кветак да помніка загінулым у гады Вялікай Айчыннай вайны настаўнікам і вучням школы.

***— Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў — гэта ідэалагічныя работнікі, асабліва ва ўмовах прэзідэнцкай выбарчай кампаніі...***

— Выбары Прэзідэнта Беларусі — вельмі важная і лёсавызначальная падзея для ўсіх грамадзян нашай краіны, бо толькі ад нас залежыць далейшае сацыяльнае і эканамічнае яе развіццё, нашым выбарам вызначаецца будучыня нашых дзяцей і ўнукаў. Ва ўмовах глабальных выклікаў выбары становяцца ключавым момантам, што спрыяе кансалідацыі грамадства вакол агульных мэт і каштоўнасцяў. Падзеі апошніх гадоў наглядна прадэманстравалі нам важнасць адзінства ў імкненні захавання міру і спакою ў краіне. Кіраўнік дзяржавы не раз казаў пра тое, што заваяваць суверэнітэт і незалежнасць не так складана, як утрымаць.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота з архіва Наталлі Аўсяннікавай.**

## «Будучыня залежыць ад нашага выбару»

### Такі пасыл адрасуе сваім выбаршчыкам дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Андрэй АНІСІМАЎ

**Мінулы тыдзень для дэпутата быў асабліва насычаны. Парламентарый працаваў у сваёй Гродзенскай-Ленінскай акрузе № 51. Адна з яго апошніх сустрэч адбылася з калектывам філіяла № 5 «Гродзенскага камбіната будаўнічых матэрыялаў» ААТ «Краснасельскбудматэрыялы», дзе гаворка ішла аб дасягненнях краіны за апошнія дзесяцігоддзі і перспектывах яе далейшага развіцця.**



Дэпутата асабліва радуе той факт, што прадстаўнікі маладога пакалення не застаюцца ўбаку ад жыцця сваёй краіны, яны выказваюць свае меркаванні аб тых ці іншых палітычных з'явах, дзеляцца думкамі наконт работы свайго прадпрыемства, увогуле грамадскага жыцця, ролі моладзі ў палітычным будаўніцтве Беларусі. «Яны разумеюць, што ад сённяшняга выбару залежыць іх будучыня, будучыня іх дзяцей», — зазначыў Андрэй Анісімаў.

На базе філіяла адбылося абмеркаванне вытворчых і сацыяльных пытанняў у фармаце круглага стала. У ходзе размовы з кіраўніцтвам прадпрыемства, прадстаўнікамі структурных падраздзяленняў, прафаюзнага і маладзёжнага актыву былі закрануты пытанні ўмоў працы, сацыяльных гарантый, павышэння кваліфікацыі работнікаў. На думку дэпутата, такое мерапрыемства садзейнічае адкрытасці адносін і дазваляе работнікам проста весці дыялог з прадстаўнікамі ўлады, што важна для фарміравання даверлівых адносін паміж дэпутатамі і выбаршчыкамі.

— Паколькі сустрэча праходзіла падчас электаральнай кампаніі, удзельнікі дыялогавай пляцоўкі абмеркавалі ўсе этапы яе правядзення, важнасць удзелу кожнага беларуса ў гэтым знакавым для краіны працэсе. Відавочна, што нашы грамадзяне скіраваны на стваральную працу. У той час, калі за межамі Беларусі ўзводзяць агароджы і павялічваюць расходы на ваеннае ўзбраенне, у нас дзве трэці бюджэту рэгіёна накіроўваецца на сацыяльную сферу. Ахова здароўя, адукацыя, культура, спорт — вось што ў прыярытэце беларусаў. Мы хочам стварыць мірную будучыню, у той жа час зможам адстаяць інтарэсы сваёй дзяржавы і сваіх грамадзян, — падкрэсліў дэпутат.

Ён выказаў упэўненасць, што ўсе работнікі прадпрыемства возьмуць актыўны ўдзел ва ўсіх этапах электаральнай кампаніі: ад подпісу за вылучэнне кандыдата ў Прэзідэнты да непасрэдна выбараў кіраўніка дзяржавы. Сам дэпутат паўдзельнічаў у фарміраванні абласной камісіі па выбарах Прэзідэнта Беларусі, а таксама ў сумесным пасяджэнні прэзідыума Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў і Гродзенскага гарвыканкама па пытанні стварэння ў Гродне раённых камісій па выбарах Прэзідэнта Беларусі. Гэтыя крокі, на яго думку, можна лічыць ключавымі ў падрыхтоўцы выбарчай кампаніі.

У дэпутата нямала сустрэч, якія прысвечаны электаральнай кампаніі. Так, у лістападзе сумесна з прадстаўнікамі дэпутацкага корпуса горада і вобласці адбылася сустрэча з працоўным калектывам Гродзенскага агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры.

— Асноўным пытаннем для абмеркавання стала тэма «Трэба» — трэба рыхтавацца да выбарчай кампаніі, ведаць яе асноўныя этапы, кандыдатаў на вышэйшую дзяржаўную пасаду, у якіх умовах яна будзе праходзіць, у прыватнасці, аб унутраных і знешніх пагрозах і не дапускаць хістання краіны, — падкрэсліў суразмоўнік.

Падчас работы ў акрузе Андрэй Анісімаў часта сустракаецца з маладым пакаленнем. Адна з такіх сустрэч адбылася з педагогамі і вучнямі СШ № 2 імя Саяпіна ў Гродне. Вучняў цікавіла як дэпутацкая дзейнасць госця, так і яго жыццёвы шлях. Дэпутат расказаў, што ён родам з расійскага горада Североуральска, скончыў Акадэмію МУС Беларусі па спецыяльнасці «Правазнаўства», Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце, праходзіў службу ў аддзеле крымінальнага вышуку і па барацьбе з незаконным абаротам наркотыкаў, Камітэце дзяржаўнай бяспекі, узначальваў Гродзенскі філіял «Белпошта», узнагароджаны медалямі і ганаровымі граматамі. Што датычыцца дэпутацкай дзейнасці, Андрэй Анісімаў у Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі з'яўляецца членам Пастаяннай камісіі па заканадаўстве.

Многія вучні хацелі пачуць рэкамендацыі аўтарытэтнага госця наконт выбару будучай прафесіі. Наогул, якія якасці і навыкі патрэбны для паспяховай кар'еры ў палітыцы і грамадскім жыцці? Дэпутат адказаў, што ў нашай краіне ёсць шмат магчымасцяў для набыцця прафесіі, для самарэалізацыі. У Беларусі дзеля гэтага створана адпаведная матэрыяльна-тэхнічная і прававая база.

Прыкладам сацыяльнага клопату дзяржавы аб юных грамадзянах з'яўляецца ўвод у строй новых важных аб'ектаў, прымеркаваных да Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі. Так, Андрэй Анісімаў узяў удзел у адкрыцці самага буйнога ў рэгіёне дзіцячага садка «Васілёк» у новым мікраёне Грандзічы. Сучасны аб'ект абсталяваны ўсімі неабходнымі сродкамі выхавання і навучання, скіраваны на падтрымку гарманічнага развіцця маленькіх беларусаў.

У гэты ж час пабываў на адкрыцці стадыёна ў гімназіі № 10 імя Мітрапаліта Філарэта ў Гродне. Стадыён аднавіўся дзякуючы дапамозе гарадскіх улад, кіраўніцтва гімназіі і саміх будаўнікоў.

— Развіццё інфраструктуры важна для моладзі, бо спорт адыгрывае ключавую ролю ў фарміраванні здаровага ладу жыцця, садзейнічае павышэнню інтарэсу да фізічнай актыўнасці падрастаючага пакалення. Толькі сацыяльна арыентаваная краіна можа зрабіць такі падарунак сваім юным грамадзянам, — упэўнены дэпутат.

Важным аспектам у рабоце дэпутата з'яўляюцца прыёмы грамадзян. Адзін з апошніх прайшоў сумесна з прадстаўнікамі абласнога і гарадскога Савета дэпутатаў. Пытанні ў большасці датычыліся сферы ЖКГ, тэмы спорту, у прыватнасці развіцця хакея. Як вядома, гродзенскі хакейны клуб «Неман» — адзін з наймацнейшых у Беларусі. Па словах парламентарыя, усе заяўнікі атрымалі разгорнутыя адказы па сваіх пытаннях, асобныя аспекты ўзяты на дапрацоўку адпаведнымі спецыялістамі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

# ШЧАСЦЕ ТАМ, ДЗЕ СЯМ'Я

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На прыкладзе сям'і, якая ўжо выхоўвае дваіх дзяцей і чакае з'яўленне трэцяга, спецыяліст пералічыла шэраг выплат і льгот, на якія можна прэтэндаваць. Жанчына, якая чакае дзіця, з 30-га тыдня цяжарнасці мае права на дапамогу па цяжарнасці і родах, што прызначаецца і выплачваецца аднаразова. Бальнічны адкрываецца з 30-га тыдня цяжарнасці на 126 каляндарных дзён (у выпадку ўскладненых родаў ці нараджэння дваіх і больш дзяцей — на 140 каляндарных дзён). Маці можа знаходзіцца ў водпуску па доглядзе да дасягнення дзіцяці трох гадоў.

Не так даўно з'явілася магчымасць у тат узяць у такі важны для сям'і перыяд аплачаны водпуск на 14 каляндарных дзён. Яшчэ адна працоўная гарантыя: калі ў жанчыны заканчваецца кантракт, наймальнік павінен яго прадоўжыць да спаўнення дзіцяці пяці гадоў. Калі жанчына стала на ўлік ва ўстанову аховы здароўя да 12 тыдняў цяжарнасці і выконвала рэкамендацыі ўрача, то пры нараджэнні дзіцяці ёй будзе выплачана яшчэ адна дапамога ў памеры бюджэту пражытачнага мінімуму — на сёння гэта 437,8 рубля.

Калі ў сям'і з'яўляецца трэцяе дзіця, аднаразовая дапамога ў сувязі з яго нараджэннем складзе 14 бюджэтаў пражытачнага мінімуму (БПМ) — 6129 рублёў (калі першае дзіця — 10 БПМ, або 4378 рублёў). Адразу маці прызначаецца дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў. Яе памеры залежаць ад сярэдняй заработнай платы работнікаў па краіне і ад колькасці дзяцей у сям'і. На другое і трэцяе дзіця дапамога складае 40 % ад сярэдняй заработнай платы, сёння гэта амаль 889 рублёў. Пры гэтым калі ў сям'і выхоўваюцца яшчэ дзеці, на кожнае выплачваецца дапамога.

З нараджэннем трэцяга дзіцяці шматдзетная сям'я можа звяртацца ў органы сацыяльнай абароны па прызначэнне сямейнага капіталу. Акрамя таго, сям'я мае права на дзяржаўныя сацыяльныя льготы, устаноўленыя для шматдзетных сем'яў. Гэта і падатковыя вылічэнні, і магчымасць для працоўных бацькоў сумяшчаць работу і выхаванне дзяцей у выглядзе аднаго свабоднага дня ў тыдзень, і працоўныя гарантыі па прадаўжэнні кантрактаў і па атрыманні водпускаў у зручны для сям'і час.

Акрамя таго, шматдзетная сям'я мае права на паляпшэнне жыллёвых умоў. Пры захаванні адпаведных норм заканадаўства яна становіцца на ўлік і, згодна з дзейным заканадаўствам, цягам года накіроўваецца на будаўніцтва. Пры гэтым дзейнічаюць праграма выдзялення безнаяўных жыллёвых субсідый і праграма льготных крэдытаў на будаўніцтва жылля.

Для сем'яў, дзе адначасова нарадзілася двое ці трое дзетак, даецца аднаразовая выплата ў памеры двух БПМ на кожнае дзіця. Дадаткова ў Мінску па рашэнні Мінскага гарадскога савета дэпутатаў пры нараджэнні тройні штомесяц выплачваецца БПМ на кожнае дзіця да дасягнення імі трох гадоў. Акрамя таго, сем'і, у якіх нарадзіліся двайняты або трайняты, маюць права на бясплатнае харчаванне для дзяцей першых двух гадоў жыцця. Таксама такое права маюць сем'і з дзецьмі, дзе даход меншы за крытэрый патрэбы. Гэтыя сем'і могуць прэтэндаваць і на атрыманне дзяржаўнай адраснай дапамогі.

Сем'і, якія выхоўваюць дзіця-інваліда, двайнят або трайнят, маюць права на паслугі нянькі — 20 ці 40 гадзін на тыдзень у залежнасці ад катэгорыі сям'і.

— Мы, вывучаем сітуацыю ў кожнай сям'і, якая знаходзіцца ў нас на ўліку, каб маці, якая не ведае пра нейкія меры сацыяльнай падтрымкі, магла пра іх даведацца і рэалізаваць свае правы. Найперш гэта сем'і, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў: улічваючы загружанасць такіх маці, яны не заўсёды маюць час сачыць за зменамі ў заканадаўстве, — адзначыла Вольга Васілеўская.

## КАМФОРТНЫЯ ЎМОВЫ

Беларусь знаходзіцца на 25-м месцы ў рэйтынгу самых камфортных для мацярынства краін, а таксама ўваходзіць у лік 50 найлепшых краін па вядзенні цяжарнасці і родаў кваліфікаваным медыцынскім персаналам, расказала **намеснік дырэктара па педыятрыі РНПЦ «Маці і дзіця» Алена УЛЕЗКА**. У краіне 100 % родаў прымаюцца кваліфікаваным медперсаналам ва ўстановах аховы здароўя.

— Не абмяркоўваецца пытанні родаў дома, дзе жанчыны маюць істотныя рызыкі. Мы прапагандуем толькі такі спосаб, і ён нашым насельніцтвам падтрымліваецца, — падкрэсліла медык.

Усе жанчыны забяспечаны дародавай і пасляродавай дапамогай. У прыватнасці, праводзіцца скрынінг дародавых парокаў плода, які праходзіць 97 % цяжарных, пры гэтым штогод выяўляецца 1200—1300 парокаў развіцця. У такім выпадку ёсць магчымасць скарэкціраваць іх дзякуючы так званай фетальнай хірургіі.

Вядзецца службай аховы мацярынства і дзяцінства і работа па перадабортным кансультаванні ў супрацоўніцтве з праваслаўнай царквой. З пачатку года дзякуючы гэтаму ўдалося захаваць больш за тры тысячы цяжарнасцяў. Істотна знізілася колькасць абортаў сярод падлеткаў — амаль на 40 %.

Працягвае дзейнічаць праграма, якая дае магчымасць адной бясплатнай спробы ЭКА. Яе выніковасць — 45 %, і гэта супастаўляльны з агульнаеўрапейскім паказчык.

Развіваецца праграма сямейна-арыентаванага аказання дапамогі. Яна пачынаецца ад нараджэння — з бальніцы, добразычлівай дзіцяці. Іх у краіне 31, і колькасць будзе павялічвацца.

— Тут важная прапаганда груднога кармлення, і ўсе маці на яго сарыентаваны. З самага першага дня дзіця знаходзіцца разам з маці — гэта ўжо сямейная арыентацыя і магчымасць у далейшым стварыць асаблівае кантактаванне з дзіцем, — патлумачыла Алена Улезка.

Існуе цэлая сістэма дапамогі дзецям. Гэта і 42 цэнтры ранняга ўмяшання, куды могуць звяртацца бацькі, калі ёсць нават нязначныя праблемы. Штогод у цэнтрах аказваюць дапамогу 12 тысячам сем'яў. Гэта дае магчымасць папярэдзіць захворванне ці аблегчыць жыццё дзіцяці-інваліда.

Наладжана і катамністычнае назіранне — новая форма аказання дапамогі неданошаным дзецям. Такія малыя маюць шэраг праблем, і ім патрабуецца шматгадовае назіранне рознымі спецыялістамі.

Пашыраецца сетка мадэльных цэнтраў па навучанні бацькоў асновам бяспечнай жыццядзейнасці дзяцей, дзе расказваюць, як зрабіць бяспечнай прастору вакол дзіцяці, каб яно не нашкодзіла сабе: не праглынула батарэйку, не атрымала апёк, не ўпала з вышыні. Пашыраецца работа цэнтраў, сяброўскіх падлеткам, іх на сёння 58, і амаль 200 тысяч маладых людзей удзельнічаюць у мерапрыемствах гэтых устаноў.

## З ВЫСАКАРОДНАЙ МІСІЯЙ

Грамадскія арганізацыі, у прыватнасці Беларускі саюз жанчын, праводзяць шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на падтрымку маладых людзей і папулярызацыю сямейных каштоўнасцяў.

— Гэта сусветныя тэндэнцыі, і іх наша моладзь часам пачынае трансліраваць: позняе ўступленне ў шлюб, позняе нараджэнне дзяцей, прыярытэт аднаму дзіцяці, негатоўнасць у прынцыпе нараджаць дзяцей, аднаполыя шлюбы. Беларускі саюз жанчын лічыць сваёй місіяй трансляцыю традыцыйных сямейных каштоўнасцяў і нараджэнне дзяцей у поўных сем'ях, — адзначае **член праўлення і намеснік старшыні ГА «Беларускі саюз жанчын», намеснік дырэктара па медыцынскай экспертызе і рэабілітацыі РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Іна САЛДАЦЕНКА**.

У рамках акцыі «Здароўе жанчыны — здароўе нацыі» сумесна з медыцынскімі спецыялістамі БСЖ праводзіць у жаночых калектывах сустрэчы па рознай тэматыцы, напрыклад, па ранняй дыягностыцы злаякасных наватвораў. Падчас такіх сустрэч праводзяцца і скрынінгавыя мерапрыемствы.

Падчас акцыі «Матуляй быць крута» БСЖ наведвае ВНУ і сустракаецца са студэнткамі.

— Напярэдадні Дня бацькі БСЖ дэбютаваў з акцыяй «Татам быць крута» на базе Акадэміі МУС. Цікавасць маецца да такіх акцый, і мы плануем іх працягваць, — дадала Іна Салдаценка.

Пра важнасць сямейных каштоўнасцяў паразважаў і **настаяцель прыхода храма свяціцеля Мікалая Японскага горада Мінска, старшыня Сінадальнага аддзела па пытаннях сям'і, абароны мацярынства і дзяцінства Беларускай праваслаўнай царквы протаіерэй Павел СЯРДЗЮК**.

— Падчас свайго служэння я сустракаюся з суджэнцамі, якія спынілі свае шлюбныя адносіны. Акрамя грамадзянскага шлюбу ў іх быў шлюб царкоўны — таінства вянчання. І я заўважыў такую татальную тэндэнцыю, якая мяне трывожыць: негатоўнасць увогуле ўступаць у дыялог са сваім былым мужам. Як правіла, так разлютаваны жанчыны. Прысутнічае крыўда на мужчын, нават калі ёсць агульныя дзеці. Неадрэфлексаванасць, непрапрацаванасць не дазваляюць рухацца далей, бо мы можам завяршыць штосьці, толькі прымірыўшыся. А гэта прабачэнне, і яго трэба прасіць у таго чалавека, з якім мы будавалі сямейны дом, хоць ён і не атрымаўся. А прабачэнне — гэта блаславенне, і яно — адна з асноў шчаслівага шлюбу і сям'і.

Протаіерэй звярнуў увагу, што згодна з апытаннямі Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў, сярод асноўных каштоўнасцяў беларусы называюць мір, дабрабыт і сям'ю. І нярэдка чалавек усё роўна ўступае ў паўторны шлюб, жадаючы паўтарыць тую мадэль, якая не атрымалася.

— Чаму так? На гэта ў царквы ёсць адказ: сужэнства мае райскае ўкараненне, райскае паходжанне. І мы імкнёмся папоўніць сябе ў іншым чалавеку, таму ў сям'і вельмі важныя блаславенне, удзячнасць, адкрытасць на дзяцей, — рэзюмаваў айцец Павел.

**Алена КРАВЕЦ.**

Неасабісты суб'ектыў



# СКРАДЗЕНЫЯ ЛІЧБЫ,

## або Як цётка Галя ў Нацбанк ператварылася

МАЯ цётухна Галя, нягледзячы на свае за семдзесят, асоба надзвычай актыўная і цікаўная. Яна заўжды ў курсе ўсіх падзей і ўсіх навін, карацей кажучы, з тых бадзёрых бабуль, якіх на мякіне не правядзеш. У тым неаднойчы пераканаліся рознага кшталту махляры, якія званілі цётцы то з паведамленнем пра аварыю, у якую нібыта трапіў яе сын, то з папярэджаннем, што з яе рахунку спісваюцца грошы. Усе яны былі пасланыя цёткай Галяй у вядомым усім напрамку, аб чым яна сама нярэдка са смехам расказвала. Мабільны тэлефон у цёткі самы просценькі, кнопачны, яна катэгарычна адмаўлялася ад прапановы падарыць ёй новы, сучасны, зноў жа найперш з меркаванняў асцярожнасці. Маўляў, я сама яшчэ толкам у ім не разбіруся, а махляры залезуць і штo-небудзь скрадуць. Карацей, я асабіста за сваю сваячку ў плане «разводу» ашуканцамі была спакойная. Як аказалася, дарэмна.

НЕКАЛЬКІ дзён таму пабачыла я ў сваім «Вайберы», што цётка Галя там з'явілася. Ну, думаю, дзеці ўсё-ткі ўгаварылі тэлефон памяняць. Але што ж яны ёй за аватарку замест фота паставілі? Павялічыла і бачу: «Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь». Застаўка ў афіцыйных колерах банка, як у іх на сайце... Першае, што прыйшло ў галаву: цётухна ўвогуле адмовілася ад мабільнага нумара, і яго падхапіў спецыяліст Нацбанка, які вядзе ў месенджарах агульнадаступны чат... Але ўсё роўна нешта ў гэтым мне не спадабалася, і я набрала цётчын мабільны нумар — той самы, прывязаны да «Вайбера».

Пачуўшы пасля гудка знаёмы голас, я асцярожненька так спытала: «А ці не рэгістраваліся вы ў «Вайберы»?» «Ой, Ленaчка, не ты першая пытаешся. І сястра званіла, і пляменнік, віншавалі з тым, што нарэшце новы тэлефон купіла. А я пра той «Вайбер» і не чула нічога, і тэлефон у мяне ўсё той жа. Сын нават да мабільнага аператара звяртаўся, але там сказалі, што нічога не зробяць...» «Цёць Галя, гэта махляры...» І цётка, усхліпваючы, пачала мне расказваць, як яна, «старая дурніца», папалася.

ПАТЭЛЕФАНАВАЛІ ёй на дамашні нумар і паведамілі, што звоняць з «Энергазбыту», бо трэба памяняць лічыльнік. «Энергазбытчык» аказаўся ветлівым, нават пацікавіўся, як да цёткі звяртацца. І Галіна Антонаўна нічога не западозрыла, бо дзе лічыльнік, а дзе махляры? А той расказваў ёй, што лічыльнік будзе суперсучасны, па ім можна будзе адсачыць і камунальныя рахункі, і запазычанасць, калі такая ўтворыцца, і ўсё гэта будзе ў рэжыме анлайн перадавацца на мабільны. На што цётка адказала, што ніякага анлайну ёй не трэба, што тэлефон у яе кнопачны і ўвогуле стары лічыльнік яе цалкам задавальняе. «Ну што вы, Галіна Антонаўна, замяніць трэба абавязкова, гэта гарадская праграма, толькі вы ў мікраараёне са старым лічыльнікам засталіся. Тым больш гэта абсалютна бясплатна». «Дык мяняйце, што вам ад мяне трэба?» — слушна спыталася цётка, бо лічыльнік у яе не ў кватэры, а на лесвічнай пляцоўцы. «А трэба нам, шаноўная Галіна Антонаўна, унесці вас у базу, а для гэтага дайце нам свой мабільны нумар, мы вам прышлём на яго эсэмэску, а вы нам тыя лічбачкі прадыктуеце...» Цётка Галя ніколі з смс-кодамі справы не мела і папярэджанне аб тым, што гэта інфармацыя строга канфідэнцыяльная і яе нікому перадаваць нельга, міма вачэй прапусціла. Прадыктавала «энергетыку» тыя чатыры лічбы, што прыйшлі, пачула ў адказ абяцанне, што сёння-заўтра лічыльнік памяняюць.

Але сумненні ўзніклі амаль адразу пасля таго, як паклала трубку. Выйшла на пляцоўку, паглядзела — лічыльнікі ад усіх кватэр аднолькавыя, ніхто іх не мяняў. Пайшла па суседках, перапытала: нікому, акрамя яе, з «Энергазбыту» не званілі. «Галя, гэта махляры!» — упэўнена сказала адна з іх... Паразважаўшы, цётка ў міліцыю тэлефанаваць не стала: па-першае, было сорамна, што так пракалолася; па-другое — і гэта галоўнае — супакоіла сябе (дый сын пасля пацвердзіў) тым, што красці ў яе ашуканцам не было чаго — зноў жа з-за прымітыўнага тэлефона і адсутнасці якой бы то ні было сувязі з інтэрнэтам. На тым амаль і супакоілася, толькі ўвесь час дакарала сама сябе, што вось так папалася...

ЦЁТКА Галя памылялася — махляры знайшлі, што ў яе скрасці. Вядома, ёй сапраўды пашанцавала, бо, калі б яна прадыктавала той код з смс, які прыйшоў на сучасны падключаны да інтэрнэту і да анлайн-сервісаў смартфон, злачынцы б атрымалі доступ да ўсіх яе акаўнтаў і пароляў з усімі выцякаючымі адсюль дрэннымі наступствамі. Але ў яе скралі... сам тэлефонны нумар, зарэгістраваўшы на яго «Вайбер», а пасля, як высветлілася, і «Тэлеграм» — нумар жа для месенджараў быў свабодны...

Што гэта дало махлярам? Шанц быць пачутымі. Апошнім часам, у тым ліку дзякуючы і інфармацыйнай кампаніі, якую актыўна праводзяць праваахоўнікі, нашы грамадзяне сталі больш пільнымі. І перш чым адказаць на званок у «Вайберы», «Тэлеграме» ці «Вацапе», звяртаюць увагу, адкуль тэлефануюць. Так што дазваніцца з нумара, зарэгістраванага ў Літве, Малдове ці на Філіпінах, становіцца амаль бесперспектыўна. А тут рэгіструешся на беларускі нумар (з дапамогай гаспадара сім-карты, бо на яе прыходзіць той самы код, без якога зарэгістравацца не атрымаецца), прымацоўваеш аватарку якога-небудзь банка ці міліцэйскага ўпраўлення, напрыклад, і звоніш беларусам, якія ўжо не такія даверлівыя, але ўсё ж. Двое праігнаруюць, трэці адкажа — нумар жа беларускі, ці мала што. А далей — па адпрацаванай схеме, і ўжо грошы пацярпелага ў кішэні ашуканца, які недасягальны за мяжой, а то й увогуле за акіянам.

ЧЫМ, акрамя прыкрасці на самога сябе, гэта ж можа скончыцца для тых, у каго нумар скралі? Падмануты з гэтага нумара пацярпелы звернецца ў міліцыю і там абавязкова высветляць, каму гэты нумар належыць. І адпаведна прыйдуць да яго высвятляць. Вядома, ва ўсім разберуцца, але ці патрэбен пажылому чалавеку (а менавіта нашы бабулі з дзядулямі карыстаюцца кнопачнымі, свабоднымі ад зарэгістраваных на іх месенджараў тэлефонамі) гэткі стрэс?.. У тым ліку і з нагоды таго, што, карыстаючыся іх нумарам, падманваюць і абкрадаюць людзей.

ШТО рабіць, спытаеце, калі махляры прыдумляюць усё новыя і новыя схемы? Банальна, магчыма, гучыць, але — быць уважлівымі. Заўважыўшы, што бабуля ці дзядуля раптам сталі карыстацца «Вайберам» ці «Тэлеграмам», не жартуйце, што вось прагрэс дабраўся і да самых адсталых слаёў насельніцтва. Пазваніць і пацікавіцца, а заадно і спытаць пра настрой, пра здароўе — гэта ж так проста. Калі западозрыце нешта неладнае паклапаціцеся набраць 102. Ну і вядома, перш за ўсё зразумець самім, зрабіць так, каб зразумелі і нашы састарэлыя сваякі, што ўся інфармацыя, якая наша, асабістая, — нават нумар мабільнага, — можа стаць прыладай для злачынства і ўцягнуць у злачынную схему яе ўладальніка. Таму, дзелячыся ёй з кімсьці, асабліва па тэлефоне, трэба яшчэ дваццаць раз падумаць, ці варта гэта рабіць.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания
· Взыскание задолженности
· Проведение торгов
· Ликвидация
· Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ООО «Санбридж», УНП 193082719, 220030, г. Минск, ул. Мясникова, д. 32, пом. 2 (каб. 30, этаж 7) |

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| № | Наименование (назначение), адрес | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|
| 1 | Кухонное оборудование для пункта общественного питания (79 позиций, новое) | 323 616,03 |
| 2 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали. Размер 2100/1000/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-ADV | 1 056,00 |
| 3 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали. Размер 2200/1000/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-ADV | 1 056,00 |
| 4 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали. Размер 1650/1100/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-ADV | 1 872,00 |
| 5 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали. Размер 2600/1000/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-ADV | 3 456,00 |
| 6 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали, Г-образная форма. Размер 2600/2400/1200/1000/600 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-ADV | 4 224,00 |
| 7 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали с ультрафиолетовым фильтром и панелью управления. Размер 2600/1400/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-Jet Stream A-UV | 26 304,00 |
| 8 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали с ультрафиолетовым фильтром и панелью управления. Размер 6300/2600/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-Jet Stream D-90-UV | 39 360,00 |
| 9 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали с ультрафиолетовым фильтром и панелью управления. Размер 6300/2600/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-Jet Stream D-90-UV | 39 360,00 |
| 10 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали с ультрафиолетовым фильтром и панелью управления. Размер 1300/1500/600 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-Jet Stream A-90-UV | 16 320,00 |
| 11 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали с ультрафиолетовым фильтром и панелью управления. Размер 1300/1300/600 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-Jet Stream A-90-UV | 14 352,00 |
| 12 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали с ультрафиолетовым фильтром и панелью управления. Размер 2450/1400/650 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-Jet Stream A-90-WW Mistry | 24 768,00 |
| 13 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали с ультрафиолетовым фильтром и панелью управления. Размер 2400/1300/650 mm, торговая марка – Vianen, мод. V-Jet Stream E-90-UV | 28 320,00 |
| 14 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали. Размер 2000/1400/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-Jet Stream A-90 | 15 408,00 |
| 15 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали. Размер 4000/1900/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-Jet Stream A-90 | 17 280,00 |
| 16 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали. Размер 3700/1400/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-ADV | 1 776,00 |
| 17 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали. Размер 990/990/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-ADV | 1 488,00 |
| 18 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали. Размер 2350/1100/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-ADV | 2 016,00 |
| 19 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали с ультрафиолетовым фильтром и панелью управления. Размер 3400/2400/600 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-Jet Stream E-90-UV | 61 920,00 |
| 20 | Кухонная вытяжка-фильтр из нержавеющей стали. Размер 990/990/500 мм, торговая марка – Vianen, мод. V-ADV | 1 344,00 |
| 21 | Отопительное оборудование, состоящее из 6 позиций (котел паровой, экономайзер, шкаф управления и т. д.) | 138 528,00 |
| 22-63 | Ковровое покрытие тканное, тип Wilton для апартаментов тип King (дизайн ME-227-C, состав 80 % шерсть, 20 % нейлон), торговая марка – Alarwool, мод. дизайн ME-227-C (рулон 77.8 кв. м, размер 19.45*4) | 2 053,17 |
| 64 | Приточная установка Hidria, тип П-29, В-29, заводской номер 55685 2000, 2014 г. в. | 69 600,00 |
| 65 | Приточная установка Hidria, тип П-30, В-30, заводской номер 55686 2000, 2014 г. в. | 40 920,00 |
| 66 | Приточная установка Hidria, тип П-21, В-21, заводской номер 55687 2000, 2014 г. в. | 36 120,00 |
| 67 | Приточная установка Hidria, тип П-23, В-23, заводской номер 55688 2000, 2014 г. в. | 28 080,00 |
| 68 | Приточная установка Hidria, тип П-24, В-24, заводской номер 55689 2000, 2014 г. в. | 23 760,00 |
| 69 | Приточная установка Hidria, тип П-18, В-18, заводской номер 55690 2000, 2014 г. в. | 39 840,00 |
| 70 | Приточная установка Hidria, тип П-28, В-28, заводской номер 55691 2000, 2014 г. в. | 101 880,00 |
| 71 | Приточная установка Hidria, тип П-1, В-1, заводской номер 55692 2000, 2014 г. в. | 53 760,00 |
| 72 | Приточная установка Hidria, тип П-16, В-16, заводской номер 55693 2000, 2014 г. в. | 29 760,00 |
| 73 | Приточная установка Hidria, тип П-19, В-19, заводской номер 55694 2000, 2014 г. в. | 63 120,00 |
| 74 | Приточная установка Hidria, тип П-34, заводской номер 55695 2000, 2014 г. в. | 30 480,00 |
| 75 | Приточная установка Hidria, тип П-20, заводской номер 55696 2000, 2014 г. в. | 11 280,00 |
| 76 | Приточная установка Hidria, тип П-33, заводской номер 55697 2000, 2014 г. в. | 18 360,00 |
| 77 | Трансформатор ТМГ12-1250/10-У1, заводской номер 1818792, 2014 г. в. | 15 480,00 |
| 78 | Трансформатор ТМГ12-1250/10-У1, заводской номер 1816989, 2014 г. в. | 12 360,00 |
| 79 | Сухой трансформатор с литой изоляцией Zucchini, заводской номер 102065, 2014 г. в. | 36 000,00 |
| 80 | Сухой трансформатор с литой изоляцией Zucchini, заводской номер 102066, 2014 г. в. | 36 000,00 |
| 81 | Сухой трансформатор с литой изоляцией Zucchini, заводской номер 102067, 2014 г. в. | 36 000,00 |
| 82 | Сухой трансформатор с литой изоляцией Zucchini, заводской номер 102068, 2014 г. в. | 36 000,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронных торгов** – 5 % от начальной цены лота

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций - Торги» https://iintorgi.by

**Срок подписания договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) рабочих дней** со дня проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов: не позднее 30 (тридцати) календарных дней** со дня заключения договора купли-продажи. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества

**Торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций - Торги», размещенном по адресу: https://iintorgi.by**

Победитель публичных торгов (аукциона), либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить аукционисту торгов вознаграждение в размере **1 % – 2 % от цены продажи лота, в зависимости от цены продажи лота**

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона) по лотам №№ 1–63:** 23.12.2024 г., начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются с 21.11.2024 г. по 20.12.2024 г. до 16.00.
**Дата и время проведения торгов (аукциона) по лотам №№ 64–82:** 24.12.2024 г., начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются с 23.11.2024 г. по 23.12.2024 г. до 16.00

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже земельных участков в частную собственность

**Организатор электронных торгов:** Новоселковский сельский исполнительный комитет, 222838, Минская область, Пуховичский район, Новоселковский сельсовет, аг. Новоселки, ул. Ленинская, 1а, тел.: +375 (29) 500 69 15, +375 (17) 134 57 09.
**Оператор электронной торговой площадки:** ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».
**Торги проводятся 26.12.2024 г.** на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by.**
**Время торгов** устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме.

| № лота | Местонахождение земельного участка; кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура | Начальная цена лота, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Сумма затрат на организацию и проведение торгов, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | аг. Новосёлки, ул. Садовая, уч. 4; 624484306101000384 | 0,1155 | Газоснабжение, электроснабжение | 4 261,95 | 426,00 | 1 837,60 + публикация в СМИ |
| 2 | дер. Михайлово, ул. Центральная, У-23; 624484305601000152 | 0,2469 | Газоснабжение, электроснабжение, водоснабжение | 9 826,62 | 982,00 | 1 372,17 + публикация в СМИ |
| 3 | аг. Новосёлки, ул. Садовая, уч. 2; 624484306101000382 | 0,1419 | Газоснабжение, электроснабжение | 5 236,11 | 523,00 | 1 736,58 + публикация в СМИ |
| 4 | аг. Новосёлки, ул. Садовая, уч. 1; 624484306101000381 | 0,1460 | Газоснабжение, электроснабжение | 5 387,40 | 538,00 | 1 723,73 + публикация в СМИ |

**Продавец: Новосёлковский сельский исполнительный комитет, аг. Новосёлки, ул. Ленинская, 1а; тел.: 8 (017) 1345709, 8 (017) 1346708.**

**Окончание приема заявлений на участие в торгах с прилагаемыми к ним документами** – 20.12.2024 г. до 15.00.

**Задаток** для участия в торгах перечисляется на текущий (расчетный) банковский счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Срок внесения задатка** – не позднее даты и времени окончания приема заявлений на участие в торгах.

**Назначение платежа**: внесение суммы задатка для участия в электронных торгах.

**Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах с прилагаемыми к ним документами – 17.12.2024 г. до 15.00.**

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник–пятница, 8.00–13.00, 14.00–17.00).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 г. № 143.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов **подлежат возмещению** в порядке, предусмотренном в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу – **https://au.nca.by,** Пуховичского районного исполнительного комитета – **www.pukhovichi.qov.by.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Лидский завод электроизделий»**

**Аукцион состоится 04.12.2024 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1:<br>- капитальное строение, инв. № 420/С-3236 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад материалов), общей площадью 510,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Толстого, 14Б;<br>- капитальное строение, инв. № 420/С-102172 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – сооружение благоустройства), общей площадью 1520,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Толстого, 14Ж/12;<br>- зеленые насаждения: газон обыкновенный (площадью 1394,0 кв. м), липа (19 шт.), рябина (6 шт.), яблоня (1 шт.), ясень (2 шт.), клен ясенелистный (1 шт.), живая изгородь (20 м. п.).<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 441300000005000213, площадью 3,6915 га (назначение – для строительства и обслуживания производственной площадки № 2), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Толстого, 14Ж/6. Земельный участок является неделимым (расположены иные объекты, не подлежащие продаже). Оформление земельного участка будет осуществляться после реализации имущества |
| **Начальная цена продажи** | **ЛОТ № 1** – 145 992,60 руб. (сто сорок пять тысяч девятьсот девяносто два рубля шестьдесят копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | **ЛОТ № 1** – 14 599 руб. (четырнадцать тысяч пятьсот девяносто девять рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.<br>**Последний день приема заявлений – 02.12.2024 г. до 15.00** |

Условия проведения аукциона: возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Полесьеэлектромаш», Брестская область, г. Лунинец, ул. Красная, 179. УНП 200106183 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига 40, пом. 46, оф. 1 **(www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронного аукциона**

**Компрессорная**
(общ. пл. **838,2 кв. м,** инв. № 133/С-13308).
Адрес: **Брестская обл., Лунинецкий р-н, г. Лунинец, ул. Красная, 179/4**

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,4032 га,** предоставлен на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания компрессорной

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 181 200,00 бел. руб.**
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих** дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель торгов либо единственный участник, согласившиеся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 4 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 02.10.2024 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 04.12.2024 г. с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие принимаются по 03.12.2024 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

21 ЛІСТАПАДА 2024 г.
ЧАЦВЕР
№ 20 (15988)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Алена БАГАЙЧУК:

# «Захапляюся колерамі і адценнямі»



Таленавітая і працавітая — менавіта так кажуць пра дзяўчыну яе выкладчыкі. І нездарма: за плячыма Алены Багайчук — мноства перамог у мастацкіх конкурсах і ўдзел у шматлікіх выставах. А нядаўна жывапісны пейзаж 16-гадовай мастачкі нават пабываў у экспазіцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Пра гэта і не толькі размаўляем з ёй сёння.

***— Алена, калі ты пачала захапляцца маляваннем?***

— У мастацкую школу пайшла ў другім класе, але і раней любіла маляваць. Калі ж пачала актыўна ўдзельнічаць у пленэрах, то вырашыла, што і паступаць буду на мастака. Паколькі калі жывапіс — гэта маё, то чаму б не прысвяціць яму сваё жыццё?

***— А як сям'я ставіцца да хобі, якое перарасло ў прафесію?***

— Бацькам вельмі падабаюцца мае работы, асабліва маці. Айчым вось верыць, што калі-небудзь дзякуючы сваёй творчасці я буду добра зарабляць. Дарэчы, некалькі маіх работ ужо набываліся ў прыватныя калекцыі. Карацей кажучы, сям'я падтрымлівае мяне ў маім выбары. Калі б бацькі былі супраць, я не вучылася б цяпер у Мінскім дзяржаўным мастацкім каледжы імя А. К. Глебава. А ў будучыні планую паступаць на жывапісца ў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў.

***— Твае працы — гэта ў большасці сваёй пейзажы. Чаму?***

— Я проста вельмі люблю прыроду, таму мне і падабаецца яе пісаць. І ў пейзажах заўсёды ёсць дзе разгуляцца. Я гэтым карыстаюся, спалучаю розныя колеры і адценні. Шчыра кажучы, гэтым я заўсёды захаплялася. Таму і працую ў асноўным фарбамі. Часцей за ўсё — гуашшу, радзей — акварэллю. Мне нават неяк сказалі, што мая палітра — ранняя вясна. Усё таму, што адценні часта бледна-зялёныя, блакітнаватыя.

***— І колькі ж часу патрэбна на адну карціну?***

— Бывае па-рознаму. Усё залежыць ад тыпу і памеру. Эцюды, напрыклад, пішуцца адносна хутка — за 3-4 гадзіны фармат А2 будзе гатовы. Дапрацаваць эцюд таксама нядоўга. Спатрэбіцца яшчэ некалькі гадзін, каб перatварыць яго ў карціну. Але гэта будзе не самая сур'ёзная работа. Напрыклад, дыпломная зойме дні і нават тыдні, бо там вельмі доўгі і карпатлівы працэс.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Час маладых

# ДЫЯЛОГ ДЛЯ БУДУЧЫНІ

Першы Міжнародны маладзёжны форум «Дыялог будучыні» аб'яднаў у Мінску больш як 300 чалавек, сярод якіх былі пасляховыя бізнесмены, прадстаўнікі крэатыўных індустрый, а таксама моладзь з Беларусі і Данецкай Народнай Рэспублікі.

На мерапрыемстве **першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ** адзначыў, што актыўнасць беларускіх маладых людзей не можа не радаваць.

— Моладзь зацікаўлена ўдзельнічаць у эканамічных і сацыяльных праектах, і такія форумы даюць ёй магчымасць знайсці новыя кірункі для развіцця. Наша задача — падтрымаць гэту ініцыятыву і даць маладым людзям інструменты для дасягнення іх мэт. Беларусь сёння — гэта цэнтр стабільнасці і бяспекі, і менавіта тут моладзь можа адчуць падтрымку і перспектывы, —- падзяліўся ён.

Фактычна гэты форум стаў своеасаблівай платформай для абмену вопытам, укаранення інавацыйных ідэй у сферы маладзёжнага прадпрымальніцтва і, вядома ж, для ўмацавання міжкультурных сувязяў. Арганізатарамі маштабнага мерапрыемства сёлета выступілі




Фота Лізаветы ГОЛАД.

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, Цэнтр маладзёжных ініцыятыў Агенцтва стратэгічных ініцыятыў і Міністэрства маладзёжнай палітыкі Данецкай Народнай Рэспублікі.

Так, у рамках форуму прайшлі панэльныя сесіі і круглыя сталы, дзе абмеркавалі мноства актуальных тэм, сярод якіх: рэальны сектар эканомікі, новыя гарызонты развіцця прадпрымальніцтва, IT-сфера, сацыяльная місія моладзі, крэатыўныя індустрыі, спорт і бізнес, узаемадзеянне СМІ і моладзі ва ўмовах новай рэальнасці.

# Беларуская моладзь — за развіццё «зялёнай» эканомікі

Аб гэтым сведчаць даныя сацыялагічнага апытання моладзі, праведзенага ў лістападзе 2024 года Беларускім камітэтам маладзёжных арганізацый (БКМА) па заказе Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў.

«Гэта было анлайн-апытанне, у якім узяла ўдзел вялікая колькасць маладых людзей з усёй Беларусі. Моладзь актыўна падтрымлівае накіраванне дзяржавы ў пытаннях «зялёнай» эканомікі. Таксама падтрымлівае атамную энергетыку і разумее значнасць яе для нашай краіны. І актыўна ўключаецца ва ўсе акцыі, якія праводзяцца дзяржавай, у тым ліку прыборку смецця і азеляненне», — адзначыла **афіцыйны прадстаўнік БКМА Марыя КОВАЛЬ.**

У анлайн-апытанні ўзялі ўдзел 5228 рэспандэнтаў, 89 % — навучэнцы школ, тэхнікумаў, універсітэтаў. У тым, што трэба развіваць «зялёную» эканоміку, перакананы 90 % рэспандэнтаў, 77,9 % апытаных лічыць, што ўцягнутасць дзяржавы ў пытанні абароны навакольнага асяроддзя ўзмацнілася. Азеляненне тэрыторыі і барацьба са смеццем — найбольш распаўсюджаныя меры, якія падтрымліваюцца рэспандэнтамі.

У ліку магчымых захадаў па развіцці «зялёнай» эканомікі моладзь згадвае і атамную энергетыку. Большая частка рэспандэнтаў перакананая: Беларуская атамная энергетыка адпавядае агульнасусветным стандартам (64,27 %).

У моладзі склалася заведама станоўчае стаўленне да грамадскіх акцый экалагічнай накіраванасці (прыборка смецця, пасадка дрэў), у тым ліку ў рамках палітычнай дзейнасці. З ліку рэспандэнтаў у групе навучэнцаў школ, тэхнікумаў і ўніверсітэтаў — 80 % падтрымала б стварэнне грамадскіх аб'яднанняў экалагічнай накіраванасці.

Таксама маладыя людзі бачаць значны патэнцыял ва ўзаемадзеянні з Расіяй і Кітаем па пытаннях «зялёнай» эканомікі. На іх думку, асноўнымі партнёрамі Беларусі ў галіне «зялёнай» эканомікі могуць выступіць Расія (72 %), Кітай (52 %), ЕС (26 %).

Такім чынам, ідэі «зялёнай» эканомікі і абароны навакольнага асяроддзя знаходзяць падтрымку ў беларускай моладзі. Сфарміраваўся запыт на ўцягнутасць дзяржавы ў пытанні абароны навакольнага асяроддзя. Нароўні з ідэямі ветра- і сонечнай электрагенерацыі юнакі і дзяўчаты станоўча ацэньваюць намаганні дзяржавы па азеляненні, прыборцы смецця, развіцці электратранспарту.

# «Захапляюся колерамі і адценнямі»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

***— Выходзіць, што кожны дзень займаешся творчасцю?***

— Так, асабліва цяпер, пасля паступлення ў мастацкі каледж. Апроч заняткаў, патрабуецца яшчэ і шмат часу на хатняе заданне. Але, калі выдаюцца вольныя хвіліны, імкнуся займацца ўласнай творчасцю. Кожныя выхадныя выходжу, каб зрабіць невялікія замалёўкі.

***— Што самае складанае ў працэсе работы над карцінай?***

— Бывае, што гадзіну ці дзве толькі ходзіш — шукаеш прыдатнае месца. Я лічу за лепшае на гэтым сіл не эканоміць. Вельмі важна, каб натура падабалася, прыносіла задавальненне. Мне здаецца, гэта бачна і па выніку, наколькі часам цяжка напісаць тое, што не падабаецца. Але часта існуюць абмежаванні па часе. У такіх выпадках нічога не зробіш — трэба пісаць тое, што ёсць. Бывае, праўда, толькі ў працэсе разумееш, што месца не такое ўжо і дрэннае, якім яно падалося на першы погляд. Так здарылася, напрыклад, калі я працавала над карцінай «Во дворе», што ў верасні гэтага года знаходзілася ў Нацыянальным мастацкім музеі. Спачатку з-за дрэў зусім не разумела, што там знаходзіцца. Але калі пачала працаваць колерам, усё стала на свае месцы, і далей справа пайшла лёгка.





***— Раскажы падрабязней пра гэтую карціну. Што за месца на ёй намалявана?***

— Увесну мы паехалі ў Смалявіцкі раён. Раней мы з маёй настаўніцай Вікторыяй Рыгораўнай Андрушынай ужо ездзілі туды для падрыхтоўкі творчага праекта, пісалі эцюды. На гэты раз выбар упаў на дом кагосьці з мясцовых. Ён мне вельмі спадабаўся: навокал растуць бярозы, а па двары куры гуляюць. На карціне яны таксама ёсць.

***— Ці не гэтая работа ў конкурсе «Образ Родины любимой» стала найлепшай у жанры жывапісу?***

— Менавіта яна. Неабходна было прайсці адбор на раённым этапе, абласным і толькі потым — на рэспубліканскім. І ўжо на «рэспубліцы» мая работа і ўзяла першае месца сярод удзельнікаў 16—18 гадоў. Выходзіць, я, будучы вучаніцай мастацкай школы, спаборнічала са студэнтамі каледжаў. Шчыра кажучы, няхай і часта ўдзельнічаю ў конкурсах, займаю прызавыя месцы, усё роўна, даведваючыся пра перамогу, спачатку думаю: «Напэўна, журы памылілася». Здаецца, што ёсць работы не горшыя, а часам нават і лепшыя. Вядома, гэта не адмяняе радасці і гонару за сябе, таму і цяпер, ужо ў каледжы, планую працягваць падаваць свае работы на конкурсы рознага маштабу.

***— Ты часта выходзіш на пленэры. Як рэагуюць прахожыя?***

— Пазітыўна, запомнілася нават некалькі гісторый. Напрыклад, аднойчы ў Лагойску да мяне пад'ехаў дзядуля на «Жыгулях». Ён хвілін 15 угаворваў, каб я пайшла маляваць менавіта яго хату. Распавёў, што пчальнік ёсць, абяцаў мёдам пачаставаць, калі я яму карціну намалюю. Але часу ўжо заставалася няшмат, ды і ехаць аказалася далёка.

А вось пленэр у Нясвіжы мне запомніўся, паколькі быў маім першым выязным. Спачатку думала, што маляваць у незнаёмым горадзе вельмі складана і страшна. Але як толькі пагрузілася ў працэс, то ад страху не засталося і следу. Набыла цікавы вопыт. Ёсць цяпер, што прыгадаць.

***— Пайшоў трэці месяц тваёй вучобы ў Мінску. Ужо знайшліся любімыя месцы ў сталіцы?***

— Мне ў душу заўсёды западаюць старэнькія сельскія домікі. Я іх шмат і часта пішу. Бывае проста міма праходзіш — і ўжо натхняешся. Як ні дзіўна, такія дамы ў Мінску таксама ёсць, напрыклад на Паўночным завулку. Ну і, вядома, люблю гуляць па цэнтры: Нямізе, вулачках Верхняга горада, Траецкага і Ракаўскага прадмесцяў. А яшчэ вельмі падабаецца раён Асмолаўка.

***— А дзе параіш шукаць натхненне ў Лагойску?***

— Пад Лагойскам ёсць мноства сёл, і ў кожным абавязкова знойдзецца пара цудоўных, так любімых мною старэнькіх хацінак. Заўжды, калі не ведаю, што маляваць, іду да такіх або на прыроду. Яна там надта прыгожая! Часта любуюся мясцовымі азёрамі, няхай і не магу сказаць, што заўсёды выходзіць добра іх напісаць.

***— Падзелішся сваімі планамі на будучыню?***

— Планую вучыцца, самаразвівацца, а яшчэ хачу зрабіць калісьці сваю персанальную выставу. Гэта не так проста, як можа падацца на першы погляд. Выстава — ключавы момант, які абагульвае творчасць, таму яна павінна мець уласны характар, а ў работах — счытвацца адзіная лінія. Пакуль што мы разам з маім выкладчыкам яе толькі намацваем. Думаю, у аснове выставы будуць эцюды, у першую чаргу — пейзажы, якія я так люблю.

**Аміна НАЗАРАВА.**
**Фота з архіва гераіні.**

*Важны старт*

# Час выбраў іх для гісторыі

Жарко Петан неяк сказаў: «Аб светлай будучыні клапоцяцца палітыкі, аб светлым мінулым — гісторыкі, аб светлай сучаснасці — журналісты». І з гэтым выказваннем складана спрачацца. Бо менавіта ад майстроў слова залежыць, як будуць транслявацца і тлумачыцца сённяшнія падзеі, як захаваецца памяць аб мінулым і які фундамент створыцца для новых пакаленняў. Гэтыя галасы народа звяртаюць увагу на вострыя праблемы, аналізуюць карціну свету, шукаюць прычынна-выніковыя сувязі. Падобную адказнасць ужо сёння вырашылі адчуць на сабе і шэсць дзяўчат, якія ўвайшлі ў першы студэнцкі інфармацыйны атрад «МедыяВектар» імя Героя Савецкага Саюза Сямёна Шаламовіча Гурэвіча. Што чакае юных медыйшчыкаў? Давайце даведаемся разам!

Так, 15 лістапада ў Гродне прайшоў маладзёжны дыялог «Час выбраў НАС», асноўнай тэмай якога сталі студэнцкія атрады. Адным з ключавых для ўсіх прысутных і самым трапяткім для студэнтаў 2-га курса кафедры журналістыкі ГрДУ імя Янкі Купалы стаў момант уручэння пуцёўкі першаму ў Рэспубліцы Беларусь студэнцкаму інфармацыйнаму атраду — «МедыяВектар». Ён выступае ўнікальнай пляцоўкай для маладых людзей, якія жадаюць звязаць сваё жыццё з журналістыкай, даючы ім магчымасць атрымліваць практычны вопыт і развіваць свае навыкі.

— Сёння мы далі старт вельмі важнаму кірунку ў дзейнасці студэнцкіх атрадаў. Стварылі новую галіну для нашых байцоў інфармацыйнага профілю: будучых карэспандэнтаў, журналістаў, той моладзі, якая хацела б паспрабаваць сябе ў такой важнай прафесіі, — адзначыў **першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ**. — Ужо сёлета мы дасягнулі высокіх паказчыкаў: працаўладкавалі звыш 54 тысяч маладых людзей. Каля дзвюх тысяч наймальнікаў — арганізацыі, якія далі пуцёўку моладзі ў жыццё, у прафесію, пуцёўку ў кар'еру, пуцёўку для развіцця і стварэння Беларусі.

**Камандзір інфармацыйнага атрада «МедыяВектар» Вікторыя МІРОНАВА** расказвала, што даведалася пра першы медыяатрад у краіне ад загадчыка кафедры журналістыкі ГрДУ імя Янкі Купалы Іны Мінчук. Прапанову падтрымалі ініцыятыўныя студэнты, і вось сёння мы можам бачыць натхнёных дзяўчат у байцоўках інфармацыйнага атрада. Адна з мэт, да якой ідуць у нашай краіне, — захаванне праўдзівай гістарычнай памяці. І, каб яе дасягнуць, перад студэнтамі была пастаўлена важная задача: запісаць інтэрв'ю-ўспаміны ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, якія пражываюць у Гродне. Іх пакаленне апошняе, хто мае магчымасць пагутарыць з жывымі сведкамі падзей ваеннага ліхалецця, таму атрад ужо два тыдні плённа працуе, бо работы шмат.



— Для мяне гэта не проста праект, а штосьці большае. Я ўжо маю вопыт зносін з ветэранамі і стаўлюся да іх з асаблівым трапятаннем. Хочацца дапамагчы захаваць успаміны, гісторыі сапраўдных герояў. Яны — не толькі наша мінулае, а і наша жыццё. Вельмі хочацца зрабіць так, каб вайна стала не проста гістарычнай падзеяй, а гісторыяй жывых людзей, — дзеліцца ўражаннямі ад работы над праектам Вікторыя.

Безумоўна, адной з пераваг работы ў студэнцкім атрадзе з'яўляецца атрыманне пэўнага вопыту і ведаў, якія спатрэбяцца дзяўчатам на прафесійным шляху. А яшчэ лепш, калі студэнты маюць магчымасць пазнаёміцца з патэнцыяльнымі працадаўцамі. Так, будучым медыйшчыкам паспрабаваць сябе ў журналісцкім майстэрстве даў магчымасць дырэктар Тэлерадыёвяшчальнага канала «Гродна Плюс» Сяргей Мазайла.

**Камісар інфармацыйнага атрада «МедыяВектар» Дар'я БАКШУК** расказала:

— Праца ў студэнцкім атрадзе, а ў нашым выпадку яшчэ і ў першым інфармацыйным медыяатрадзе ў краіне, — гэта не проста крок у будучыню, а шанц зрабіць яго больш яркім і паспяховым. Ужо цяпер, на 2-м курсе, у нас ёсць унікальная магчымасць паспрабаваць сябе ў ролі прафесійных журналістаў. Вядома, некаторы вопыт мы атрымлівалі на нашай першай летняй практыцы, якую, дарэчы, я таксама праходзіла на базе Тэлерадыёвяшчальнага канала «Гродна Плюс». Праца ў атрадзе дае ўпэўненасць у сабе і сваіх сілах. Ты даведаешся, на што ты здольны, якія ў цябе ёсць таленты і як іх можна развіваць. Гэта не проста работа, а магчымасць адчуць сябе важным і патрэбным, унесці свой уклад у гісторыю.

**Анжаліка СЦЕФАНОВІЧ,**
**фота аўтара.**

*Крокі сталення*

# «Мне падабаецца рабіць свет лепшым»

Выезд на месцы злачынстваў, пранізлівы погляд і пошук доказаў — менавіта гэтымі словамі можна ахарактарызаваць прафесію нашага новага героя — 22-гадовага эксперта-крыміналіста Аляксея Карповіча, з якім мы і правялі адзін дзень на яго працоўным месцы.

Прыехаўшы ў экспертна-крыміналістычны аддзел, перш за ўсё мы, як і належыць кожнаму навічку, пазнаёміліся з **часова выконваючым абавязкі начальніка Першамайскага міжраённага аддзела (г. Мінск) Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз падпалкоўнікам юстыцыі Аляксандрам АНДРЭЙЧЫКАВЫМ.**



— Рады, што вы сёння завіталі да нас у госці. Мы дастаткова маладая арганізацыя, нашаму камітэту сёлета якраз споўнілася адзінаццаць гадоў. Наогул у нас працуюць розныя спецыялісты: гэта і судова-медыцынскія эксперты, судовыя эксперты-псіхіятры, эксперты-лінгвісты, эксперты-хімікі, пажаратэхнікі і шмат іншых яшчэ кірункаў. Сярод іх таксама эксперты-крыміналісты. З адным з іх вы сёння і праведзяце час. Працу экспертаў-крыміналістаў можна падзяліць на дзве часткі: першая — агляд месца здарэння і пошук доказаў, а другая — непасрэдна напісанне экспертыз. Маладых спецыялістаў у нас працуе многа. Кожны з іх мае добрыя задаткі і амбіцыі — разумеюць усю адказнасць нашай прафесіі. Зрэшты, іншыя да нас не прыходзяць. Ну а мы, у сваю чаргу, робім усё, каб павышаць іх прафесійны ўзровень і даваць дадатковую матывацыю для якаснай працы.

Пасля невялікай уступнай гутаркі Аляксандр Мікалаевіч павёў нас знаёміцца з самім героем — Аляксеем. Па шляху мы ўбачылі, як яго калега, таксама малады спецыяліст, з сабраным ужо чамаданам чакае ліфт і адпраўляецца на выезд да месца здарэння ў складзе следча-аператыўнай групы.

З **Аляксеем КАРПОВІЧАМ** мы сустрэліся ў кабінеце і пасля знаёмства адразу ж задалі яму наша галоўнае пытанне: «Ці паедзем мы на выезд?» Але аказалася, што сёння не яго змена, таму мы застанемся ў памяшканні. Але без цікавых адкрыццяў і распаведаў нас не пакінулі. І адразу ж павялі да крыміналістычнага палігону — у памяшканне, дзе навучаюць і праводзяць тэсціраванні для супрацоўнікаў.

— Зусім нядаўна я быў студэнтам Акадэміі МУС, вучыўся па спецыяльнасці «Эксперт-крыміналіст. Юрыст», а цяпер ужо стаў паўнавартасным супрацоўнікам, які дапамагае раскрываць злачынствы. Наогул на працу ў гэтай сферы мяне натхніў мой старэйшы брат. Калі я скончыў дзявяты клас, ён якраз адвучыўся ў Акадэміі МУС і пачынаў працаваць у Следчым камітэце. Ад яго я даведаўся пра такую прафесію, як эксперт-крыміналіст, і мяне яна зачапіла. Вырашыў, што таксама хачу звязаць сваё жыццё з гэтым. І бацькі цалкам падтрымалі маё рашэнне і ганарыліся мной, калі я ажыццявіў сваю мэту і паступіў. Вядома, спачатку вучыцца было даволі складана. Перш за ўсё з прычыны таго, што ў іншым горадзе (а сам я са Слоніма) спачатку адчуваў сябе адзінокім без блізкіх, але праз нейкі час наша група стала вельмі згуртаванай, як сапраўдная сям'я. Я лічу, што гэта адбылося дзякуючы нашым выкладчыкам. Ну і, вядома, само навучанне: скажам так, гультаёў там не трымаюць, ты жывеш па вызначаным графіку, дзе вучоба стаіць на першым месцы. Пасля





заканчэння Акадэміі мяне размеркавалі на працу сюды, чаму я вельмі рады.

У гэты момант мы якраз зайшлі ў кабінет для навучання. Апынуліся ў досыць вялікім і прасторным пакоі, але, павярнуўшы галаву направа, я крыху спалохалася. Бо, акрамя імітацыі розных доказаў і прафесійнага абсталявання, на канапе мірна размясціўся манекен чалавека, які выкарыстоўваецца для адпрацоўкі алгарытму дзеянняў на месцы агляду па фактах забойстваў і іншых злачынстваў. Мая рэакцыя пацешыла Аляксея, бо яго, як чалавека звыклага да падобнага, ні манекенам, ні сапраўдным трупам ужо не напалохаць. Праца абавязвае мець халодны розум і ўстойлівую вытрымку.

— У нашай прафесіі няма месца эмоцыям, — дзеліцца хлопец. — Калі я трапіў у Першамайскі міжраённы аддзел па размеркаванні, мае чаканні наконт працы абсалютна супалі з рэальнасцю. Пасля Акадэміі ў нас было складанае ўяўленне аб тым, што ўяўляе сабой гэта прафесія. Але ўсё роўна прысутнічалі моманты, якія я змог пазнаць і асвоіць толькі падчас працы, усё ж такі ў такой сферы практыка важней, чым тэорыя. Не магу не адзначыць, што мае старэйшыя калегі заўсёды гатовыя дапамагчы нам, і, калі ў нас узнікаюць пытанні, мы заўсёды можам звярнуцца да іх у любы час.

Як ужо паведамлялася, мы сустрэліся з нашым героем у яго невыязную змену. У такіх выпадках яго працоўны дзень пачынаецца ў дзевяць раніцы і заканчваецца ў шэсць вечара. Асноўная задача супрацоўніка — праводзіць экспертызы і пісаць заключэнні. А вось што датычыцца дзяжурстваў, то яны доўжацца дванаццаць гадзін — з дзевяці раніцы да дзевяці вечара і адпаведна з дзевяці вечара да дзевяці раніцы. Перш за ўсё крыміналіст дакладвае аб заступленні на дзяжурства сваім кіраўнікам і ў дзяжурную частку. У чаканні выклікаў, якіх бывае не менш чым тры за суткі, кры-




міналіст праводзіць экспертызы. Але як толькі раздаецца званок, ён ужо ў якасці спецыяліста яшчэ раз пераправярае свой чамадан, «узбройваецца» і адпраўляецца на выклік.

— Самымі распаўсюджанымі прычынамі выезду з'яўляюцца крадзяжы грашовых сродкаў і махлярства. Мне асабліва запомніўся выпадак махлярства, калі маці сказалі, што яе дачка трапіла ў аварыю і трэба перадаць грашовыя сродкі. Жанчына на эмоцыях перадала грошы кур'еру, і ён знік. Па прыбыцці на месца здарэння я выявіў след рукі, які потым супаў са следам падазраванага. І ў выніку злачынец быў злоўлены і пакараны. Гэта мая любімая частка работы, калі разумееш, што ты змог дапамагчы людзям і зрабіць свет крышачку лепшым.

Не ў сілах стрымаць сваю цікавасць, мы адправіліся прымерыць на сябе ролю крыміналіста і вывучыць, што ўсё ж такі захоўваецца ў іх чароўных чамаданах. Па-першае, што варта адзначыць, важаць яны нямала: больш за дзесяць кілаграмаў, таму трэба валодаць пэўнымі фізічнымі данымі, каб вазіць іх з выезду на выезд. Што датычыцца ўнутранага напаўнення, то ў ім знаходзіцца набор прылад, неабходных, каб знайсці на месцы злачынства доказы. Напрыклад, там ляжаць ліхтарыкі, наборы для капіравання аб'ёмных слядоў, парашкі і інструменты для зняцця адбіткаў пальцаў. Ёсць і звычайныя слясарныя прылады, каб пры неабходнасці выняць доказы з цяжкадаступных месцаў. Што мяне асабліва здзівіла, дык гэта наяўнасць у чамадане лаку для валасоў. Аказваецца, ён дапамагае зафіксаваць сляды злачынца. Акрамя вывучэння прафесійнага інвентару, мы паглядзелі і астатнія зоны для трэніровак. Напрыклад, імітацыю слядоў чалавека і транспарту, а таксама зону, дзе прапрацоўваюць пытанні, якія датычацца злачынстваў з алкаголем і забароненымі рэчывамі. Пасля курса маладога крыміналіста мы адправіліся ў лабараторыю, дзе праводзяць экспертызы. Стэрыльнасць і парадак у гэтым месцы не могуць не захапляць. Якраз у той момант да нас далучыўся Аляксандр Мікалаевіч і асабіста распавёў, у чым заключаецца працэс правядзення экспертызы адбіткаў пальцаў. Дарэчы, цікавы факт: нават калі мы атрымалі драпіну на падушачцы пальца, праз некаторы час адбітак вернецца ў першапачатковы стан. Так у працэсе размоў і ўласных адкрыццяў мы і не заўважылі, як наша сустрэча падышла да фіналу.

— Наша прафесія не простая, але вельмі важная. Нават калі ўжо прыступіў да працы, усё роўна павышаеш сваю кваліфікацыю, бо тэхнічны прагрэс не стаіць на месцы і мы таксама. Таму сваім будучым калегам, якія цяпер яшчэ праходзяць навучанне, я хачу пажадаць стойкасці, каб развівалі ў сабе дысцыпліну, ну і проста ўдачы, яна ў нашым жыцці лішняй не бывае.

**Ангеліна НОВІКАВА.**

**Фота аўтара і з архіва героя.**




*Ініцыятывы*

# АКЦЭНТ НА ЯКАСЦЬ І ПАДТРЫМКУ

Новы 14-ы сезон Рэспубліканскага маладзёжнага праекта «100 ідэй для Беларусі» стартаваў у пачатку лістапада на базе Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Падчас мерапрыемства першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ адзначыў, што ў Год якасці важна, каб узрасла якасць праектаў, якія рэалізоўваюцца канкурсантамі.



— Менавіта таму аргкамітэт прыняў рашэнне арганізаваць асобную намінацыю за якасць прапрацоўкі і ўкаранення ідэі ў рэальны сектар эканомікі. Хочацца, каб нашы канкурсанты, а гэта не толькі школьнікі і студэнцкая моладзь, але і маладыя спецыялісты, праявілі свае веды ў інтэграцыі з установамі адукацыі і навукі, — падкрэсліў ён.

Удзельнікаў мерапрыемства, сярод якіх былі маладыя вучоныя, прадстаўнікі найбуйнейшых устаноў вышэйшай адукацыі краіны, навукова-даследчых інстытутаў і цэнтраў, чакала цікавая праграма. Так, яны з задавальненнем азнаёміліся з пастаянна дзейнай выставай «Дасягненні айчыннай навукі — вытворчасці», дзе прадстаўлены апошнія распрацоўкі беларускіх вучоных, наведалі Музей гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і ўзялі ўдзел у фарсайт-дыскусіі «Моладзь Беларусі: навука і інавацыі».

Паводле слоў **старшыні прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзіміра ГУСАКОВА,** у Акадэміі навук створаны маладыя акадэміі, у якіх вопытныя вучоныя працуюць з дзецьмі, прычым нават малодшага ўзросту.

— Маладыя акадэмікі пакрокава далучаюць падрастаючае пакаленне да навукі. Дзяцей не адцягнуць ад доследаў, яны гараць жаданнем эксперыментаваць, і мы павінны падсілкоўваць іх цікавасць.

Таксама ён дадаў, што добрым стартам для маладых даследчыкаў стане конкурс «100 ідэй для Беларусі».

— Гэта выдатная пляцоўка для далучэння моладзі да навуковых даследаванняў і распрацовак. Арыентуючыся на актуальныя кірункі, маладое пакаленне зможа прапанаваць для эканомікі нашай краіны, яе развіцця свае ідэі ў розных галінах: ад мікраэлектронікі і прыборабудавання да медыцыны і аграпрамысловага сектара. У іх для гэтага ёсць вялікі патэнцыял.

У сваю чаргу **старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Сяргей ШЛЫЧКОЎ** падкрэсліў, што конкурс «100 ідэй для Беларусі» служыць першым узроўнем адбору інавацыйных ідэй.

— Другі ўзровень — рэспубліканскі конкурс інавацыйных праектаў, што праводзіцца ДКНТ, на які сёлета з больш як 200 заявак 63 пададзены пераможцамі конкурсу «100 ідэй для Беларусі». Для 13 з іх мы на бязвыплатнай аснове распрацавалі бізнес-план. Гэта сведчыць, што выбудаваная ў краіне сістэма работы з маладзёжнымі навуковымі ініцыятывамі працуе.

Традыцыйна старт новага сезона і пачатак прыёму заявак былі дадзены націскам на сімвалічную кнопку. Сёлета выдзелена тры ўзроставыя групы ўдзельнікаў, экспертны савет будзе выбіраць з ліку навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, студэнтаў, курсантаў, працуючай моладзі, маладых вучоных, прадстаўнікоў устаноў, арганізацый, падпарадкаваных НАН Беларусі па тры пераможцы ў кожнай з дзесяці намінацый. Рэалізоўваць конкурс плануюць у чатыры туры: першы — інфармацыйны, другі — адборачны, трэці — прадугледжвае арганізацыю Мінскай гарадской, абласных выставак-прэзентацый і, нарэшце, чацвёрты — рэспубліканскі фінал, які будзе праведзены да 30 красавіка 2025 года.

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**

**У тэму**

# Праект з імем

Беларуская моладзь рэгулярна ўдзельнічае ў інтэнсівах і конкурсах розных узроўняў, мэта якіх — папулярызацыя тэхналагічнага прадпрымальніцтва сярод маладзёжнай аўдыторыі, забеспячэнне экспертнай і арганізацыйнай падтрымкі стартап-праектаў, выяўленне інвестыцыйна прывабных ідэй. Сярод іх «100 ідэй для Беларусі», асноўная задача якога — укараненне праектаў у рэальны сектар эканомікі. Карэспандэнт «Чырвонкі. Чырвонай змены» даведаўся пра падрабязнасці знакавага праекта.



Сёння можна ўпэўнена казаць пра тое, што за 13 сезонаў праекта знайшлі прымяненне на практыцы больш як 3,5 тысячы ініцыятыў яго ўдзельнікаў. Пра гэта расказала прэс-сакратар Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Кацярына Лакісава.

— «100 ідэй для Беларусі» — праект з імем у нашай краіне. У 2023 годзе на конкурс было пададзена 1,3 тысячы заявак. Тым не менш на дасягнутым мы не спыняемся і вельмі чакаем, што ў новым сезоне лічба вырасце, — звярнула ўвагу прэс-сакратар БРСМ. — Асноўны акцэнт, вядома, робім не на колькасці заявак, а на іх якасці, бо галоўная мэта праекта — укараненне нашых праектаў у рэальны сектар эканомікі.

За ўсе сезоны праекта ў ім узялі ўдзел больш як 18,6 тысячы чалавек. Таксама адзначылі, што праект «100 ідэй для Беларусі» праводзіцца не толькі на конкурснай аснове. Акцэнт зроблены ў тым ліку на навучанні ўдзельнікаў, каб моладзь змагла дапрацаваць або палепшыць свае інавацыйныя ідэі.

